ПРАЛЕТАРЫІ УСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

ЛІТАРАТУРА І МАСТАЦТВА

ОРГАН МІНІСТЭРСТВА КУЛЬТУРЫ І ПРАЎЛЕННЯ САЮЗА ПІСЬМЕННІКАЎ БССР

№ 13 (1547) | Аўторак, 14 лютага 1961 года | Цана 4 кап.

ВЕДЫ—СЕЛЬСКІМ ПРАЦАЎНІКАМ

Калі чытаеш газеты, слухаеш радыё, адчуваеш імклівы пульс нашага жыцця, багатага радаснымі падзеямі. І горад і вёска аднолькава заняты творчай працай. І нічога, што бязмежныя калгасныя прасторы яшчэ занесены снегам. Жыццё ні на хвіліну не спыняецца: наліваецца свежымі сокамі, набіраючы новыя сілы перад вясной, карміцелька-зямля. І працаўнікам калгаснай вёскі некалі адпачываць. Студзеньскі Пленум ЦК КПСС заклікае ўзяць новыя рубяжы ў сельскай гаспадарцы.

Паглядзіце, як рупліва працуюць цяпер на фермах калгасныя і саўгасныя жывёлаводы, як старанна рамантуюць тэхніку да выхаду ў поле механізатары, як заклапочаны аграномы, брыгадзіры, калгаснікі, распрацоўваючы планы веснавой сяўбы, як уважліва падлічваюць свае магчымасці, вышукваючы новыя рэзервы.

Адзін з надзейных рэзерваў далейшага ўздыму сельскай гаспадаркі— гэта шырокае ўкараненне ў практыку дасягненняў навукі, вопыту перадавікоў — запявалаў новага ў калгаснай вёсцы. Іх многа, гэтых маякоў, якія асвятляюць шлях да багацця прадуктаў, да ўздыму ўсіх галін сельскай гаспадаркі.

Слава і гонар вам, сціплыя працаўнікі вёскі! Гэта вы сваёй самаадданай працай набліжаеце светлы дзень камунізма. З вас, маякоў нашага часу, бяруць прыклад цяпер усе, хто хоча праславіць сваю Радзіму новымі здабыткамі ў працы.

Мікіта Сяргеевіч Хрушчоў на студзеньскім Пленуме ЦК КПСС гаварыў: «Давайце возьмем арыентацыю на гэтыя маякі, возьмем правільны курс, не балбатаць, не абмяжоўвацца агульнымі заклікамі: таварышы, рабіце гэтак, будзьце свядомымі і г. д. А трэба самім ведаць метады работы перадавікоў, трэба самім вучыцца ў гэтых перадавых людзей, і не толькі вучыцца і заклікаць іншых браць прыклад з перадавікоў, але арганізацыйна дапамагаць людзям стаць на ногі, правільна арганізаваць вытворчасць. Тады мы можам хутчэй ісці наперад».

Дапамагчы калгаснаму сялянству хутчэй ісці наперад закліканы таксама работнікі культурнага фронта. У гэтай важнай надзённай справе для іх адкрываюцца невычэрпныя крыніцы. Рэзерваў тут сапраўды непачаты край. Адным з дзейсных сродкаў прапаганды перадавога вопыту з'яўляецца паказ калгаснікам, работнікам саўгасаў навукова-папулярных і сельскагаспадарчых фільмаў. І сапраўды, калі нашы кінафікатары сур'ёзна ўсвядомяць усю важнасць ускладзеных на іх абавязкаў, яны зробяць сапраўды высакародную справу — навучаць вопыту перадавікоў новыя тысячы працаўнікоў калгаснай вёскі.

Кіно—самы масавы від з усіх мастацтваў. У нашай рэспубліцы працуе больш дзвюх тысяч сельскіх стацыянараў і кінаперасовак. Калі як след арганізаваць паказ на сельскіх экранах фільмаў аб новым у калгаснай і саўгаснай вытворчасці, як удзячны будуць нашым кінамеханікам працаўнікі вёскі!

З гэтай мэтай міністэрствы культуры і сельскай гаспадаркі рэспублікі праводзяць чарговы кінафестываль сельскагаспадарчых фільмаў на вёсны з 15 лютага па 15 мая. Гэта, вядома, не значыць, што прапаганду сельскагаспадарчых фільмаў трэба абмежаваць выключна гэтым тэрмінам. Абавязак кожнага сельскага кінафікатара — займацца прапагандай перадавога вопыту з дня на дзень, высвятляць, у чым маюць найбольшую патрэбу калгаснікі, і дамагацца таго, каб іх заяўкі выконваліся.

Фестываль сёлетняга года набывае асаблівае значэнне, бо мае на мэце дапамагчы нашым калгасам і саўгасам выйсці на перадавыя рубяжы трэцяга года сямігодкі. Поспех фестывалю, вядома, будзе залежаць ад таго, як органы і работнікі культуры, разам з сельскагаспадарчымі органамі, здолеюць на месцах арганізаваць гэтую справу. У рэдакцыю паступаюць паведамленні аб тым, што ў радзе раёнаў рэспублікі дзейсна рыхтаваліся да фестывалю. У Бярэзінскім раёне, напрыклад, сакратар райкома партыі тав. Савельеў гутарыў з кожным старшынёй калгаса аб тым, як лепш правесці фестываль, што для гэтага трэба зрабіць. У гэтую справу ўключылася і райсельгасінспекцыя. Агульнымі намаганнямі распрацаваны план правядзення фестывалю ў кожным калгасе. У раёне штомесячна праводзіцца «дзень брыгады», і заўсёды сельскія кінамеханікі выкарыстоўваюць гэтую ўдзячную аўдыторыю — ставяць спецыяльныя фільмы. Амаль усе калгасы раёна заключылі ўжо дагаворы на дэманстрацыю сельскагаспадарчых фільмаў.

У Бярэзінскім раёне ёсць кінамеханікі, якія ўмела прапагандуюць сельскагаспадарчыя фільмы. Вось механік Рыгор Гулькевіч. Ён ставіць фільмы ў трох калгасах і ўжо ў студзені прадэманстраваў шэсць сеансаў такіх карцін. І кінамеханік Сцяпан Алексіевіч таксама ахвотна дапамагае калгаснікам дамагацца новых поспехаў у працы. Ён таксама сістэматычна паказвае калгаснікам сельскагаспадарчыя фільмы.

Добра наладжан паказ фільмаў аб перадавым вопыце, аб дасягненнях нашых вучоных у Аршанскім, Івацэвіцкім і іншых раёнах. Разам з тым мы не можам цярпець такое становішча, калі ў радзе раёнаў Гродзенскай і Віцебскай абласцей і па сённяшні дзень гэтай справе не аддаецца належнай увагі. Тут дэманстрацыя сельскагаспадарчых фільмаў праводзіцца ад выпадку да выпадку. Аграномы і заатэхнікі рэдка выступаюць з лекцыямі і дакладамі.

Надзвычай крыўдна, калі ў баку ад гэтай справы стаяць работнікі сельскіх устаноў культуры. Такія факты ні ў якім разе нельга дараваць. Трэба, каб да кожнага сеанса старанна рыхтаваліся і бібліятэкар, і загадчык клуба. Бібліятэка абавязана зрабіць выстаўку літаратуры на тэму фільма, правесці калектыўныя чыткі найбольш цікавых артыкулаў. Добра, калі б і сельскі клуб падрыхтаваў да гэтага дня адпаведную наглядную агітацыю — розныя табліцы, плакаты, лозунгі, а самадзейныя артысты— цікавы канцэрт. Толькі калектыўнымі намаганнямі ўсіх работнікаў культурнага фронта ў цесным кантакце з мясцовымі партыйнымі, савецкімі і камсамольскімі арганізацыямі можна дамагчыся поспехаў у правядзенні фестывалю сельскагаспадарчых фільмаў.

Варта адзначыць, што праграмы карцін, якія прапануюцца для паказу ў раёнах рэспублікі, усё яшчэ надзвычай бедныя і абмежаваныя. Вельмі ўжо мала выпускае Беларуская студыя хранікальна-дакументальных фільмаў карцін і часопісаў у дапамогу працаўнікам сельскай гаспадаркі. І сёння, напрыклад, няма фільмаў аб вопыце многіх маякоў калгаснай вёскі. Тлумачыцца гэта тым, што вельмі ўжо марудна нараджаюцца сельскагаспадарчыя фільмы на студыі.

Ёсць у нашым жыцці шмат рэзерваў і ў гэтай справе. У Гомелі, Віцебску, Мінску і іншых гарадах і раённых цэнтрах рэспублікі працуюць самадзейныя кінастудыі. Саюзу кінематаграфістаў трэба дапамагчы гэтым энтузіястам. Тады ў нас з'явяцца на сельскіх экранах новыя фільмы аб лепшых людзях калгаснай вёскі. Трэба, каб у стварэнні новых фільмаў аб нашых маяках больш актыўны ўдзел прымалі журналісты і пісьменнікі, якія жывуць і працуюць у абласцях. Яны, безумоўна, ахвотна дапамогуць самадзейным аператарам і рэжысёрам напісаць сцэнарый аб перадавых людзях нашай вёскі.

Нельга спадзявацца на самацёк, на тое, што кожны будзе дамагацца новых поспехаў у працы, кожны будзе пераймаць перадавое. Гэтай справай трэба займацца штодзённа і мэтанакіравана. Да гэтага заклікае нас партыя. І работнікі культурнага фронта рэспублікі зробяць усё, каб фестываль сельскагаспадарчых фільмаў прайшоў у Беларусі паспяхова, каб новыя тысячы маякоў яркім полымем асвятлялі наш шлях да багацця.

ЗЯМЛЯ—ВЕНЕРА

Зямля і Венера... Халодны,
бяскрайні
Прасцяг, быццам прорва, Сусвет
раздзяліў.
Адвечныя тайны, касмічныя тайны...
Мы, людзі, зямляне, на штурм іх
пайшлі!

Зямля і Венера...
Планеты-блізняты,—
Іх нехта назваў гэтак з даўняй
пары.

Сягоння вястун нашай мары
крылатай
У госці спяшае да роднай сястры.

Ляці, карабель! Ад Краіны Саветаў
Твой шлях у Сусвет, да нязведаных
зор.

Мінаюць часіны—мы верым
у гэта—
Спрадвечнай разлукі далёкіх сясцёр.

Аркадзь МАРЦІНОВІЧ.

Будні Віцебска

Віцебскі завод заточных станкоў—адно з буйнейшых прадпрыемстваў Беларусі. Добра працуе на заводзе брыгада камуністычнай працы першага механа-зборачнага цэха, дзе брыгадзірам Пятро Усаў. У гонар XXII з'езду КПСС брыгада ўзяла павышанае абавязацельства: гадавы план выканаць да дня адкрыцця XXII з'езду Камуністычнай партыі, кожнаму члену брыгады ўнесці не менш чым па адной рацыяналізатарскай прапанове, павысіць вытворчыя разрады.

Члены брыгады паказваюць прыклад у працы, быту, змагаюцца з п'янствам, з'яўляюцца актыўнымі дружыннікамі.

Брыгада Пятра Усава па пачыну мінскага наватара А. Прыходчанкі, разгарнула барацьбу за тэхнічны прагрэс на кожным рабочым месцы, за культуру працы.

Зменныя заданні брыгада выконвае на 150 працэнтаў.

НА ЗДЫМКУ: член брыгады камуністычнай працы першага механа-зборачнага цэха, камсорг цэха Уладзімір МАЛЫЖАНКОЎ за працай.

Фота Ул. Крука.

НОВЫ ЭТАП У АСВАЕННІ КОСМАСУ!

ПАВЕДАМЛЕННЕ ТАСС

У адпаведнасці з праграмай даследаванняў касмічнай прасторы 12 лютага 1961 года ў Савецкім Саюзе ўдасканаленай многаступенчатай ракетай выведзен на арбіту цяжкі штучны спадарожнік Зямлі.

У той жа дзень з гэтага спадарожніка стартавала кіруемая касмічная ракета, якая вывела аўтаматычную міжпланетную станцыю на траекторыю да планеты Венера.

Аўтаматычная міжпланетная станцыя дасягне раёна планеты Венера ў другой палавіне мая 1961 года.

Асноўнымі задачамі гэтага пуску з'яўляюцца праверка метадаў выводу касмічнага аб'екта на міжпланетную трасу, праверка звышдалёкай радыёсувязі і кіравання касмічнай станцыяй, удакладненне маштабу сонечнай сістэмы і правядзенне раду фізічных даследаванняў у космасе.

Апаратура, устаноўленая на борце міжпланетнай станцыі, працуе нармальна. Вага аўтаматычнай міжпланетнай станцыі складае 643,5 кілаграма.

Радыёперадачы з аўтаматычнай міжпланетнай станцыі вядуцца на частаце 922,8 мегагерца па камандах з Зямлі.

Аўтаматычная міжпланетная станцыя нясе вымпел з малюнкам Дзяржаўнага Герба СССР.

Назіранне за палётам аўтаматычнай міжпланетнай станцыі ажыццяўляецца спецыяльным вымяральным цэнтрам.

Паводле атрыманых даных, рух аўтаматычнай міжпланетнай станцыі адбываецца па арбіце, блізкай да разліковай.

12 лютага 1961 года ў 12 гадзін дня па маскоўскаму часу станцыя знаходзілася на адлегласці 126 тысяч 300 кіламетраў ад паверхні Зямлі над пунктам зямной паверхні з геаграфічнымі каардынатамі 86 градусаў 40 мінут усходняй даўжыні і 6 градусаў 04 мінуты паўночнай шырыні.

Паспяховы запуск касмічнай ракеты да планеты Венера пракладвае першую міжпланетную трасу да планет сонечнай сістэмы.

Цудоўная ява нашых дзён

Хто з нас у маленстве не рабіў разам з героямі Жуля Верна, Герберта Уэлса дзівосных падарожжаў на Месяц, па таямнічых глыбінях нязведаных акіянаў... А пасля наша юнацкая фантазія смела заносіла нас на далёкія планеты і зоркі.

Гэтыя мары ніколі не пакідалі людзей на працягу ўсёй гісторыі чалавецтва. Колькі складзена легенд і міфаў рознымі народамі пра смелыя, адважныя палёты да Сонца, Месяца, зор. А ляцелі ў касмічную прастору людзі на крылах арла, на чароўных дыванах...

Вучоныя ўсіх краін і народаў нястомна шукалі шляхі палёту ў дзівосны, заманіліва, загадкавы Сусвет. На шляху да заваявання касмічнай прасторы зроблена нямала геніяльных адкрыццяў вучонымі розных краін. Але толькі сціпламу рускаму настаўніку з Калугі Канстанціну Эдуардавічу Цыялкоўскаму належыць вялікі гонар — ён адкрыў людзям дарогу ў міжпланетную прастору. Яшчэ ў пачатку 900-х гадоў К. Э. Цыялкоўскі апублікаваў у Пецярбургу працу, у якой даказаў, што толькі ракета можа паляцець у касмічную прастору.

З таго часу мінула больш паўстагоддзя. Вучоныя ўсіх краін і кантынентаў настойліва працавалі над стварэннем гэтай ракеты. І мы, савецкія людзі, нашчадкі геніяльнага рускага вучонага, першыя ў свеце запусцілі штучны спадарожнік Зямлі. Гэты памятны дзень—4 кастрычніка 1957 г. — залатая старонка ў гісторыі асваення касмічнай прасторы. Мінула не так ужо багата часу — крыху больш трох гадоў. А якіх выдатных поспехаў дасягнулі савецкія вучоныя, канструктары, інжынеры, рабочыя ў асваенні космасу! Ужо ў другім штучным спадарожніку ляцеў сабака Лайка. А 2 студзеня 1959 г. наша краіна парадавала ўвесь свет запускам ракеты ў бок Месяца, якая стала першым штучным спадарожнікам Сонца.

12 верасня 1959 г. была запушчана другая касмічная ракета, якая даставіла на Месяц савецкі вымпел, а 4 кастрычніка 1959 г. запушчана трэцяя касмічная ракета, аўтаматычная станцыя якой сфатаграфавала другі, нябачны бок Месяца і перадала здымак на Зямлю.

А сёння мы з'яўляемся сведкамі новага трыумфу савецкай навукі. Гэтая вестка маланкай абляцела ўсе куткі нашай планеты. Савецкія вучоныя, інжынеры, рабочыя 12 лютага запусцілі ў касмічную прастору удасканаленую шматступенчатую ракету, якая вывела на арбіту новы штучны спадарожнік Зямлі. Упершыню ў гісторыі чалавецтва не з Зямлі, а са штучнага спадарожніка стартавала аўтаматычная станцыя ў напрамку да Венеры. Аўтаматычная станцыя нясе наш савецкі вымпел.

Палёт аўтаматычнай станцыі да Венеры, вядома, не выпадковы. Гэтая планета больш за іншыя падобна на Зямлю.

— Мы так прывыклі да бліскучых перамог савецкай тэхнікі і навукі,— гаворыць кандыдат эканамічных навук І. Расохін. — Але палёт аўтаматычнай станцыі да Венеры не можа не здзівіць кожнага чалавека. Гэта ж падумаць толькі — пракладваецца першая міжпланетная траса на далёкую зорку Венеру! Слава савецкай навуцы, слава сціплым яе працаўнікам, якія паказваюць прыклад мірнага выкарыстання дасягненняў навукі і тэхнікі!

Увесь свет радуецца выдатным поспехам савецкіх вучоных. Увесь свет здзіўлены, пачуўшы гэтую сапраўды сенсацыйную навіну. Палёт аўтаматычнай міжпланетнай станцыі на Венеру—яшчэ адзін значны ўклад савецкай навукі і тэхнікі ў асваенне касмічнай прасторы.

— Няма слоў, каб выказаць захапленне, радасць, гонар за свой народ, за сваю краіну — Радзіму такіх цудоўных, казачных спраў,— гаворыць вядучы прэсавага цэха Мінскага аўтазавода П. Пятроўскі.

Ляціць міжпланетная аўтаматычная станцыя. Яна нясе на далёкую зорку-Венеру савецкі вымпел. І мы, савецкія людзі, зычым ёй шчаслівага шляху.

Я. КАЛЯДА.

КУЛЬТУРНА-АСВЕТНАЙ РАБОЦЕ—ШЫРОКІ РАЗМАХ

Дапамагае моладзь

На фасадзе сельскага клуба з'явілася афіша: «Сёння ў 6 гадзін вечара адбудзецца сустрэча з перадавікамі сельскай гаспадаркі. Пасля — канцэрт мастацкай самадзейнасці».

Калгаснікі сельгасарцелі «40 год Кастрычніка» гаварылі: «Зноў нешта цікавае задумала наша Галя».

На сустрэчу сабралася столькі людзей, што з клуба давялося перайсці ў большае памяшканне школы, але і тут, як кажуць, не было дзе яблыку ўпасці.

Пра свой вопыт работы расказалі старэйшы жывёлавод арцелі Цім Прушак, перадавая даярка Марыя Гінько, аграном Алена Хатэнка і інш. Пасля іграла музыка, доўга не змаўкалі песні. Апоўначы вярталіся калгаснікі дадому вясёлыя, задаволеныя.

А быў жа час, калі з наступленнем вечара ў Ямінску толькі і чуліся лаянка ды песні п'яных, а на царкоўныя святы справа не абыходзілася без бойкі.

І вось пасля заканчэння Гродзенскага культасветвучылішча ў раённы аддзел культуры прыехала Галіна Мафіеня.

— У нас, — сказалі ёй, — два вакантныя месцы: у Талі і Ямінску. Куды жадаеш пайсці?

— У Ямінск, — цвёрда адказала дзяўчына.

— Што ты, — папярэдзілі ў аддзеле культуры Мафіеню. — Туды трэба чалавека не з тваім характарам. — А калі так настойваеш, ідзі, толькі глядзі, каб пасля не плакала.

Але Галіна не плакала. Праўда, цяжка было. Пачала работу камсамолка з таго, што стварыла савет клуба. У склад яго ўвайшлі работнікі сельсавета, настаўнікі мясцовай школы, медыкі. На першым пасяджэнні быў складзены план работы. Аказалася, што ў Ямінску не такія ўжо людзі благія, як пра гэта гаварылі ёй. Яны ахвотна ўносілі прапановы, падказвалі новаму загадчыку, як лепш ажыццяўляць работу.

І вось у клуб сабраліся калгаснікі на лекцыю аб культуры паводзін маладога савецкага чалавека. Настаўніца Тамара Тарасава гаварыла проста і шчыра, выкарыстоўвала мясцовыя факты, называла прозвішчы тых, хто дрэнна сябе паводзіць, хуліганіць, п'янствуе. Некаторым у той вечар давялося чырванець ад сораму. Перад усёй грамадой настаўніца асуджала іх паводзіны.

Праз некалькі дзён у клубе калектыўна чыталі раман «Маладая гвардыя». І так кожны вечар — усё новае і новае. То наладжваліся сустрэчы шашыстаў і шахматыстаў, то гутарка на тэму дня...

Колькасць наведвальнікаў клуба расла няспынна.

Задумалася Галя над тым, як стварыць гурткі мастацкай самадзейнасці. У клубе ёсць баян, гармонік, балалайкі, гітары. Ёсць у вёсцы музыканты. На вечарынцы можна было пачуць дасціпную прыпеўку, убачыць адмысловы танец. А вось на сцэне моладзь выступаць не хоча.

Аднойчы вечарам Галя ўзяла балалайку, зайграла.

— Ды хіба не бачыш, што не настроена, — сказаў Уладзімір Сігай.— Дай настрою.

У клуб зайшоў Сямён Жартун.

— Ды хіба гэта музыка, паказваючы на балалайку, — сказаў ён. — Дастань, Галя, баян.

Так памаленьку выявіліся і музыканты.

— Давайце, хлопцы, — прапанавала Галя, — струнны гурток арганізуем.

— А чаму б не, — пагадзіўся калгасны радыст Аляксандр Дзямідовіч. — Толькі закупі пабольш струн, а то за вечар усе могуць паляцець,—жартуючы дадаў ён.

Быў створан струнны гурток, а затым драматычны і харавы. Пасля працы дзяўчаты і хлопцы кожны вечар ішлі на рэпетыцыі. А праз які месяц вясковыя артысты выступілі перад калгаснікамі сельгасарцелі «40 год Кастрычніка» з першым канцэртам. Яны паставілі п'есу Я. Купалы «Прымакі». Выступалі харысты і музыканты. І няхай не ўсё было яшчэ добра ў гэтым канцэрце, але калгаснікі ад душы апладзіравалі ўдзельнікам самадзейнасці. Ішлі дні, месяцы. Больш стала ўдзельнікаў у самадзейных гуртках, пашырыўся іх рэпертуар. Ямінскіх артыстаў запрасілі да сябе жыхары суседніх вёсак: Трайчан, Азломля, Заемнае, Чабус. Асабліва спадабалася ім пастаноўка па аднаактовай камедыі А. Рылько «Гора чубатае». У рэпертуары з'явіліся частушкі на мясцовых фактах. За мінулы год самадзейныя артысты сельскага клуба наладзілі ў калгасах Ямінскага сельсавета 12 канцэртаў.

Сельскі клуб многа ўвагі аддае лекцыйнай прапагандзе і прапагандзе вопыту перадавікоў сельскай гаспадаркі. Часта з лекцыямі і дакладамі выступаюць настаўнікі Іван Сігай, Тамара Тарасава, Іна Шмуратка, урачы Іван Амяльковіч і Вольга Яковіч, спецыялісты сельскай гаспадаркі.

Ёсць пры клубе бібліятэка. Яе наведваюць каля 400 чалавек. Цяпер калгаснікі вечарамі вывучаюць матэрыялы студзеньскага Пленума ЦК КПСС, чытаюць прамовы Мікіты Сяргеевіча Хрушчова.

— Ну як, не шкадуеш, што пайшла працаваць у Ямінск? — пытаемся ў загадчыцы клуба Галіны Мафіені.

— Ніколечкі, — з усмешкай адказвае яна. — Наадварот, рада, што трапіла сюды.

В. БЫЧОК.

Любанскі раён.

ГАЛОЎНАЯ МЭТА

У адзін з пакояў райвыканкома зайшла маладых год жанчына. Твар, голас здаліся мне знаёмымі. Я недзе бачыў яе.

Ці не пазалетась ва Усялюбскім сельсавеце? Там тады праводзіўся семінар культурна-асветных работнікаў Навагрудчыны.

У райвыканкоме жанчына патрабавала, каб ёй неадкладна выдалі лесаматэрыял.

Нават закралася сумненне, ці не пайшла гэтая жанчына на гаспадарчую работу. Але не. Гэта была тая ж Соф'я Пятрэнка, загадчыца Усялюбскага сельскага Дома культуры. Лесаматэрыял ёй быў патрэбны на рамонт клуба.

Што ж змянілася ў клубе за апошнія два гады?

Невялікі будынак, куды мы ўвайшлі, абгароджаны, чыста пабелены. Ён стаіць крыху ў баку ад галоўнай вуліцы Усялюба. Але вечарамі амаль усе дарогі вёскі вядуць сюды. Аматары кіно, шахмат, кніг, газет ідуць у свой клуб. У харавым гуртку ўдзельнічае 30 чалавек, у танцавальным — 12, у струнным — 15, у драматычным — 18. Рэгулярна праходзяць рэпетыцыі, часта наладжваюцца канцэрты.

Калгаснікі добра сустракаюць выступленні агітбрыгады ва ўсіх вёсках сельсавета. Апошняе выступленне адбылося ў вёсцы Масціўча (калгас «Радзіма»). Яго праграма была накіравана супраць рэлігіі і перажыткаў мінулага. Пасля кароткай лекцыі «Рэлігія—дурман для народа» паказваюцца хімічныя вопыты, «абнаўляюцца» абразы, запальваюцца без запалак свечкі.

А потым была паказана п'еса Эдуарда Валасевіча «Цуд». Актывісткі клуба—дзесяцікласніцы Лёдзя Кармонік і Вера Грыка чыталі байкі на атэістычныя тэмы, а сёстры Соня і Лена Арцімовіч праспявалі частушкі.

Перасоўкі кніг ад бібліятэкі Усялюбскага Дома культуры ёсць у вёсках Гірдаўка і Шкелічы. У кожнай па 75—80 чытачоў. Бібліятэчку ў Шкелічах вядзе вялікі кнігалюб, загадчык пачатковай школы Аляксандр Васільевіч Клімаў.

Сёння на першым плане работы Дома культуры — прапаганда матэрыялаў студзеньскага Пленума ЦК КПСС, спаборніцтва ў гонар XXII з'езду КПСС.

Д. ЗІНГЕР.

ТРЫБУНА перадавога вопыту

З УВАГАЙ ДА КОЖНАГА ГЛЕДАЧА

За апошнія гады ў кінаабслугоўванні насельніцтва мы дамагліся некаторых поспехаў.

У нашым раёне—13 кінастацыянараў і 12 сельскіх кінаперасовак. Эксплуатацыйны план за 1960 г. па ўсіх паказчыках выкананы датэрмінова, да 15 снежня. У студзені бягучага года як гарадская, так і сельская кінасеткі працуюць не менш паспяхова. У нас нямала энтузіястаў, майстроў сваёй справы, якія ўдасканальваюць формы і метады працы. Работнікі Пагосцкага стацыянара—кінамеханік М. Гарбач, матарыст В. Гардашаўскі і загадчык клуба тав. Абазовік — змагаюцца за званне брыгады камуністычнай працы. Заданне за студзень яны выканалі на 151 працэнт. Выдатныя паказчыкі ў працы ў такіх кінамеханікаў сельскіх перасовак, як Я. Булыга, К. Янчаўскі, В. Свірыдовіч, А. Цэдрык, Н. Семяняка, І. Саснавец, В. Лобач і інш. Яны перавыканалі месячны план.

Рыхтуючыся да сустрэчы XXII з'езду КПСС, кінамеханікі і матарысты на раённай нарадзе культасветработнікаў узялі павышаныя сацыялістычныя абавязацельствы і прынялі зварот да ўсіх работнікаў кінасеткі Мінскай вобласці; яны заклікаюць выканаць план адзінаццаці месяцаў да дня адкрыцця з'езду, а гадавы—да 44-й гадавіны Вялікага Кастрычніка.

У раёне тры брыгады работнікаў кінасеткі (гарадскога стацыянара, Пагосцкага і Капланецкага сельскіх стацыянараў) і восем механікаў і матарыстаў сельскіх перасовак змагаюцца за званне брыгад і ўдарнікаў камуністычнай працы. Яны абавязаліся выканаць гадавы план да дня адкрыцця XXII з'езду КПСС.

Аддзел культуры, мясцком прафсаюза і камсамольская арганізацыя падводзяць вынікі сацыялістычнага спаборніцтва за месяц па кожнай кінаўстаноўцы. Пераможцам уручаюцца пераходныя вымпелы. У раённым Доме культуры прыгожа афармлены Дошка гонару, фатаграфіі лепшых работнікаў кінасеткі, стэнд паказчыкаў ходу спаборніцтва.

Мы ўсё шырэй і шырэй да кінаабслугоўвання насельніцтва прыцягваем грамадскасць, якая нам шмат дапамагае і кантралюе нашу работу. Грамадскі кантроль прымушае кожнага кінамеханіка і матарыста працаваць яшчэ з большай адказнасцю. Раённы аддзел культуры, райком камсамола і пярвічныя камсамольскія арганізацыі калгасаў зацвердзілі 68 кінаарганізатараў, якія актыўна ўключыліся ў работу. Адзін з лепшых кінаарганізатараў у нашым раёне—сакратар камсамольскай арганізацыі саўгаса «Дзмітровічы» тав. Канкудовіч. Раённы аддзел культуры прэміяваў яго.

Прыгожая рэклама дапамагае нам арганізоўваць гледача. У 1960 г. кінамеханікі і матарысты зрабілі рэкламныя шчыты ў кожнай вёсцы. У месцах кінапаказу ўсюды ёсць рэклама-анонс і заўсёды загадзя вывешваецца месячны графік дэманстрацыі фільмаў. Добра афармляецца рэклама на Пагосцкім, Бярэзінскім, Ляшнецкім, Капланецкім стацыянарах. У кожным сельскім клубе раёна ёсць спецыяльна абсталяваныя куткі кінагледача.

Нашы кінамеханікі і матарысты раз у квартал робяць справаздачу перад насельніцтвам у кожным пункце кінапаказу. Такім чынам, работа механіка заўсёды знаходзіцца пад кантролем грамадскасці. Гледачы выказваюць прапановы і пажаданні, на аснове якіх кінамеханік складае рэпертуарны план на наступны месяц. Заяўкі на фільмы для дзяцей узгадняюцца з настаўнікамі.

Добрая справа — кінаканферэнцыі. У мінулым годзе мы правялі восем такіх канферэнцый—у вёсках Багушэвічы, Паплавы, Пагост і інш. Спецыяльна запрашалі і тых гледачоў, якія рэдка наведвалі кіно. З цікавасцю слухалі яны даклады аб савецкім кінамастацтве. У выніку стала больш актыўных гледачоў. Пачалі наведваць кіно нават тыя калгаснікі, якія раней зусім не цікавіліся ім. Напрыклад, у в. Пагост наведванне кінасеансаў, у разліку на адпаго гледача, складала ў 1959 г. 17 разоў, а ўжо ў мінулым годзе—33.

Механікі і матарысты расказваюць аб сваёй рабоце на пасяджэннях выканкомаў і сесіях сельсаветаў. Гэта дае магчымасць выяўляць недахопы ў кінаабслугоўванні. Ліквідаваць іх часта дапамагаюць нам дэпутаты мясцовых Саветаў.

У мінулым годзе ў раёне пабудавана сем памяшканняў для электрарухавікоў і пяць кінаапаратных у вёсках Падваложна, Каменны Барок, Мацевічы, Высокая Гара, Багушэвічы і інш.

Мы праводзім дні тэхнічнай і палітычнай вучобы кінаработнікаў. У студзені для іх інструктар Мінскага абкома КПБ І. Плахатнюк і прапагандыст РК КПБ А. Багданаў прачыталі даклады «Крах каланіяльнай сістэмы» і «Заява Нарады прадстаўнікоў камуністычных і рабочых партый».

У раёне пачынаецца фестываль сельскагаспадарчых фільмаў. Калгаснікі ўбачаць карціны «Мясная свінагадоўля», «Перадавыя кукурузаводы» і інш.

За 1960 г. у раёне адбылося 1114 кінасеансаў дакументальна-хранікальных, навукова-папулярных і сельскагаспадарчых фільмаў. У 1961 г. колькасць іх павялічыцца да 1200.

Заслугоўвае ўвагі праца кінамеханіка сельскай кінаперасоўкі І. Марозава, які адмовіўся ад дапамогі майстра па рамонту кінаапаратуры і ўзяў самы цяжкі ў раёне маршрут. І. Марозаў робіць падворныя абходы, гутарыць з людзьмі. І не дзіўна, што яго кінаўстаноўка цяпер перавыконвае план па ўсіх паказчыках.

У нашым раёне працуюць кіналекторыі. Кожныя дзесяць дзён на кінастацыянарах чытаюцца лекцыі, праводзяцца гутаркі на розныя тэмы. Затым па тэме лекцыі паказваюцца фільмы.

Хочацца часцей бачыць у перыядычным друку матэрыялы аб вопыце перадавых кінаработнікаў. Гэта дапаможа нам хутчэй пераймаць усё новае і прагрэсіўнае.

М. САКАЎ,
загадчык Бярэзінскага раённага аддзела культуры.

Памяці вялікага Кабзара

У рэспубліцы створан камітэт па правядзенню стагоддзя з дня смерці вялікага Кабзара—Тараса Шаўчэнкі. У склад камітэта ўвайшлі К. К. Крапіва (старшыня), П. У. Броўка, Р. Я. Кісялёў, М. В. Дарашэвіч, Г. Н. Жабіцкі, А. Т. Караткевіч, В. П. Несцяровіч, Ул. Ул. Корш-Саблін, І. К. Казлоў, В. В. Барысенка, П. Ф. Глебка, П. С. Пестрак.

Намечаны таксама практычныя мерапрыемствы. У Мінску адбудзецца агульнагарадскі вечар. На прадпрыемствах, у навучальных установах, у калгасах у першай дэкадзе сакавіка будуць чытацца лекцыі і даклады аб жыцці і творчасці Т. Шаўчэнкі. У хатах-чытальнях, бібліятэках і рабочых клубах адбудуцца літаратурныя вечары. Па радыё і тэлебачанню будуць перадавацца гутаркі аб уплыве творчасці Кабзара на развіццё беларускай літаратуры і мастацтва, аб дружбе ўкраінскага і беларускага народаў.

Беларускае дзяржаўнае выдавецтва намеціла ажыццявіць новае, найбольш поўнае выданне твораў Т. Шаўчэнкі ў перакладзе на беларускую мову ў 1964 г.—да 150-годдзя з дня нараджэння вялікага песняра.

СЦЭНАРЫЙ — ПЕРШ ЗА ЎСЁ

Пытанне аб удзеле беларускіх пісьменнікаў у стварэнні сцэнарыяў мае не малую гісторыю. Яно востра стаяла яшчэ і тады, калі Беларуская кінастудыя працавала ў Ленінградзе; пачыналася з запрашэння пісьменніка ствараць сцэнарый і канчалася тым, што сцэнарый не ставіўся.

Амаль няма такога з беларускіх пісьменнікаў старэйшага пакалення, які б да вайны не спрабаваў сілы ў кінадраматургіі. Пісалі сцэнарыі Пятрусь Броўка, Змітрок Бядуля, Міхась Зарэцкі, Янка Маўр, Рыгор Мурашка, Міхась Лынькоў і інш.

Паўстае пытанне: калі столькі, і да таго ж лепшых, пісьменнікаў Беларусі пісалі сцэнарыі і яны не маглі быць пастаўлены ці выйшлі ў лепшым выпадку пасрэдныя фільмы, дык аб чым гэта сведчыць? Або аб фармальных адносінах да справы студыі, якая заказвала сцэнарый, плаціла грошы і не думала нават яго ставіць. Або рэжысура была бяздарная ці пісьменнікі былі няздольнымі напісаць добрыя сцэнарыі.

Думаецца, не было галоўнага: правільнага кіраўніцтва сцэнарным працэсам, ад чаго залежыць усё астатняе.

Не заўсёды на вышыні гэтае кіраўніцтва і сёння. На студыі яшчэ не ўсе разумеюць, што не кожная тэма, не кожны факт рэчаіснасці можа стаць сюжэтам кінафільма.

Чаплін у пошуках «сваёй» тэмы пераварочваў груды сюжэтаў, а сюжэт «Дыктатара» знайшоў у апавяданні невядомага пісьменніка. Бываюць тэмы спецыфічна-раманічныя, або эпічныя, і яны з незвычайнай цяжкасцю паддаюцца кінематаграфічнаму выяўленню. Вось, напрыклад, амерыканскі фільм па апавяданню Э. Хэмінгуэя «Стары і мора». Хто пойдзе на паўтары гадзіны слухаць развагі старога, які сядзіць у лодцы? А празаічны твор чытаецца з захапленнем.

Сцэнарыст уступае ў спаборніцтва з другімі аўтарамі, фільмы якіх ужо ішлі на экране і якія выходзяць ці выйдуць. Таму сюжэт, думка фільма павінны быць арыгінальнымі, свежымі, выкладзены глыбока, але ў той жа час у яркай, даступнай, захапляючай форме. Раманіст ці апавядальнік мае права напісаць не дынамічны эпізод, ён можа гэта кампенсаваць пазней у цудоўным яркім раздзеле. У фільме такой кампенсацыі няма. Сумны ці шэры кавалак можа загубіць усё добрае наступнае. Фільм прад'яўляе выключна многа даволі сур'ёзных патрабаванняў. І галоўнае з іх: ці ўсхвалюе фільм мільёны гледачоў. Вось тут патрэбна найвялікшая мудрасць кіраўніцтва кінастудыі, сцэнарнага аддзела, рэжысуры. Адказ павінен давацца, выходзячы з прынцыпаў: наколькі значная тэма, якія мажлівасці дае яна для пабудовы драматургічна складанага і ў той жа час выключна лагічнага і яснага твора. Сцэнарый не можа быць перагружаны вялікай колькасцю герояў, дзея павінна адбывацца ў розных месцах (гэта патрабаванне кіно часам трэба парушаць, калі думка патрабуе). Трэба дамагацца, каб само дзеянне, а не толькі словы, характарызавала герояў і рухала наперад фільм. Фільм павінен развіваць лагічна, па ўзыходзячай лініі напружання, ён не можа быць перагружаны хаця б нават і цудоўнымі сцэнамі або вобразамі і г. д.

Гэтыя меркаванні нялёгка ажыццявіць, асабліва, калі сама задума мала драматургічная.

Калі ідэя і галоўны герой не маюць навізны і сур'ёзнага грамадскага значэння, нельга чакаць добрага фільма.

Часта ідэя і галоўны герой грамадска значныя, але патрабуюць эпічнага, а не драматургічнага вырашэння. А мы ўсё ж пішам на гэтым матэрыяле сцэнарый. Тады ў фільме пачынаецца статыка, доўгія маналогі, героі не сутыкаюцца ў барацьбе. Гэта часцей за ўсё здараецца пры экранізацыі літаратурных твораў, прынцыпы якой у нас яшчэ не распрацаваны як след.

Беларуская студыя працягвае работу над эпапеяй Якуба Коласа «На ростанях». Цяпер ставіцца другая серыя гэтага твора, якая ахоплівае перадтурэмны і турэмны перыяды ў жыцці Лабановіча, аж да пачатку імперыялістычнай вайны.

У сувязі з выхадам першай серыі фільма шмат спрэчак было аб тым, ці мелі права аўтары сцэнарыя адступаць ад літаратурнай першакрыніцы.

Твор Якуба Коласа — выдатная эпапея, але іменна эпапея, і трэба шчыра сказаць: вельмі цяжка паддаецца драматургічнаму ўвасабленню. І правільна робяць аўтары сцэнарыя А. Куляшоў і М. Лужанін, калі выходзяць з сэнсу і духу, а не літары твора Якуба Коласа. Я не бачу іншага вырашэння гэтай цяжкай праблемы. Тут трэба смялей даваць мастацкі домысел. Інакш, калі прытрымлівацца толькі дакладнай інтэрпрэтацыі фактаў, як гэта рабілі некалі ў сцэнарыі аб Зоі Касмадзям'янскай, дык фільм траціць сваё мастацкае дыханне.

Хочацца яшчэ раз падкрэсліць, што кіраўніцтва сцэнарным працэсам вырашае вельмі многае, калі не ўсё, гэта відаць і па прыкладах сённяшняй работы студыі «Беларусьфільм».

Ужо амаль закончаны вытворчасцю фільм «Выратаваны сцяг» па сцэнарыю Стаднюка. Гэта фільм на зусім новую для беларускай кінематаграфіі тэму; аб подзвігу нашых салдат у першыя дні Айчыннай вайны. Рэжысёр І. Шульман нядрэнна паставіў фільм, але гэтую тэму, магчыма, з большым поспехам можна было б вырашыць на падставе рамана І. Мележа «Мінскі напрамак», твораў Шамякіна ці Кулакоўскага. Аднак фільм «Выратаваны сцяг» трэба лічыць поспехам студыі.

Горш справа з наступнай работай студыі — фільмам «Камсамолія». Ён, праўда, яшчэ не закончаны. І тут толькі можна сказаць аб задуме і сцэнарыях.

«Камсамолія» — чатыры навелы аб подзвігу моладзі ў дні грамадзянскай вайны, у перыяд рэканструкцыі, у час Айчыннай вайны і сёння. Сцэнарыі гэтых навел, акрамя першай, пакідаюць уражанне выпадковых эпізодаў.

Зараз студыя мяркуе паставіць сцэнарый А. Каплінскай «Дзень, у які спаўняецца 30 год».

Аб чым сцэнарый? Жанчына-мастак не хоча сядзець дома. Яна знайшла сабе занятак — кіруе мастацкім гуртком на заводзе. А муж не пускае яе на завод. Яна пакінула мужа, пасялілася ў інтэрнаце, а потым жыве ў маці. Пасля пазнаёмілася з лётчыкам-выпрабавальнікам і выйшла за яго замуж. Але на гэты раз яна ўжо не хоча, каб муж лётаў на самалётах, бо прафесія выпрабавальніка — вельмі небяспечная. Карацей кажучы, сама стала такой жа абмежаванай мяшчанкай, у чым у свой час абвінавачвала свайго першага мужа. Што аўтар хоча сказаць пра сваю гераіню? І наогул, што гэта за гераіня?

Адсутнасць у сцэнарыі сапраўднага жыцця, глыбокай грамадскай праблемы — гэта такі недахоп твора, які нічым нельга кампенсаваць.

Наступны твор, якому, праўда, не адкрыта такая зялёная вуліца, як сцэнарыю Каплінскай, гэта «Наследнікі Маркаўца» М. Гарулёва. Над ім яшчэ трэба добра папрацаваць, хоць па сваіх вартасцях ён куды вышэй за сцэнарый Каплінскай.

Рэшта сцэнарыяў — у рэзерве. Найбольш значныя з іх, якія заслугоўваюць увагі, гэта «Сярэбраная дарога» Я. Васілёнка, «Новая мама» К. Губарэвіча і «Апошні хутар» (па аповесці Я. Брыля «Галя») Г. Бекарэвіча.

У рэзерве без ясных перспектыў знаходзяцца сцэнарыі В. Віткі і Ус. Краўчанкі «Палескія зоры», Андрэя Макаёнка «Вялікая небяспека», І. Грамовіча «Прылуцкія салаўі», П. Васілеўскага «Галасы жыцця», Алены Васілевіч «Партызанская жонка» і інш.

Які ж рахунак можна прад'явіць нашай кінастудыі? Галоўнае, відаць, у тым, што яна яшчэ не стала пасапраўднаму беларускай кінастудыяй, якая ў сваіх творах павінна адлюстроўваць гераізм нашага народа ў гады ваенных нягод і ў мірны час, паказаць вобразы беларускіх рабочых, моладзі, паказаць дружбу нашага народа з вялікім рускім народам, даць вобразы герояў нашай гісторыі — Скарыны, Купалы, Каліноўскага, даць самабытную беларускую камедыю, экранізаваць найбольш значныя ў драматургічных адносінах празаічныя творы і г. д.

Вядома, нельга патрабаваць ад дырэктара студыі, сцэнарнага аддзела, рэжысёраў, каб яны замест аўтараў і пісьменнікаў пісалі сцэнарыі, але мы можам патрабаваць, каб выбар твора для экранізацыі быў не выпадковы, каб з яго атрымаўся хвалюючы, яркі фільм.

Мы можам патрабаваць, каб ужо ў працэсе абмеркавання заяўкі пісьменніка кіраўніцтва студыі магло ясна адказаць, ці ёсць драматургічна значнае, грамадска цікавае, актуальнае зерне ў прапанаванай тэме, ці варта яна той гіганцкай працы, якую патрабуе сцэнарый і фільм. І галоўнае, каб студыя мела сваю думку, а не ішла за модай, каб не заказвала сцэнарыяў па няярких у драматургічных адносінах творах. Па твору І. Шамякіна «У добры час» быў зроблены сцэнарый толькі таму, што быў створаны фільм «Кавалер Залатой Зоркі». А трэба было каадаварот: паставіць фільм па яго добрай кнізе «Крыніцы». Трэба, каб не валаводзіліся са слабым сцэнарыем «Ёсць у мяне мара» толькі таму, што хтосьці з рэжысёраў яго пахваліў, каб не трацілі на гэта грошы, не тлумілі галавы маладому здольнаму сцэнарысту. Каб не хапаліся за слабы сцэнарый «Час дзеяння — нашы дні» толькі таму, што геалагічная тэма была моднай. Яна перастала быць моднай пасля таго, як не мела вялікага поспеху ў гледача «Неадпраўленае пісьмо» і праваліўся «Хмуры Вангур».

Мы маем права патрабаваць, каб амплітуда ацэнак у студыі не была такой неверагоднай, як пры разглядзе сцэнарыя «Залатыя россыпы» М. Матукоўскага. Сцэнарый так «замучылі», што ён зусім выпаў з плана. Дарэчы, калі б на яго паклалі столькі энергіі, як на навелы «Камсамолія», атрымаўся б цікавы фільм да юбілею камсамола.

Мы маем права задаць і некаторыя пытанні. Няўжо ўсім аўтарам сцэнарыяў трэба звяртацца за рэкамендацыяй да аўтарытэту і няўжо без пратэкцыі, без рэкамендацыі нашы сцэнарыі не знойдуць шлях да гледача? І наогул, чаму такі недавер да беларускіх аўтараў, хаця яны студыі ні разу яшчэ не падводзілі?

У многіх рэжысёраў няма пафасу перакананасці. Гадамі яны прыслухоўваюцца, прыглядаюцца і ні на чым канкрэтна спыніцца не могуць, пакуль ім не падкажа хто-небудзь.

А сцэнарны аддзел заказвае сцэнарый без разліку на рэжысёра. І атрымліваецца так, што сцэнарый заказаны пісьменніку, але ж яшчэ невядома, ці захоча яго ставіць рэжысёр. Усё гэта было б лягчэй вырашыць, каб не было раз'яднанасці рэжысёраў і аўтараў.

Студыя і Саюз работнікаў кінематаграфіі павінны яшчэ больш зблізіць сваю работу з Саюзам пісьменнікаў Беларусі. Беларускіх пісьменнікаў не палохае праца, якую трэба пакласці на сцэнарый. Было б толькі на студыі добразычлівае стаўленне да іх твораў.

Алесь КУЧАР

Агляд народных аркестраў

У Пінску адбыўся конкурс на лепшы аркестр народных інструментаў у гонар стагоддзя з дня нараджэння выдатнага рускага балалаечніка-віртуоза, кампазітара і музычна-грамадскага дзеяча В. Андрэева. Гэта добрае пачынанне кіраўніцтва музычнай школы. Вырашана штогод праводзіць агляды народных аркестраў з прысуджэннем калектывам-пераможцам пераходных прызаў і ўзнагароджаннем лепшых выканаўцаў.

У аглядзе-конкурсе прынялі ўдзел аркестры гідратэхнікума, педагагічнага вучылішча, музычнай школы і рад салістаў горада.

Канцэрт адкрыў аркестр педвучылішча пад кіраўніцтвам С. Жаркова. Зладжана і пранікнёна прагучала мазурка В. Андрэева. Т. Коркіна, уладальніца прыгожага меца-сапрана, цёпла і эмацыянальна праспявала пад акампанемент аркестра рускую народную песню «Стэп ды стэп вакол». Самадзейны аркестр педвучылішча паказаў сябе сталым калектывам, які мае вялікія перспектывы на будучыню.

Затым выступілі самыя маленькія артысты, вучні музычнай школы.

Вальсам В. Андрэева пачаў выступленне аркестр гідратэхнікума.

Апладысментамі было сустрэта сола на трохструннай «андрэеўскай» балалайцы выкладчыка музычнай школы А. Галаўко. Яго змяняе выканаўца на домры Л. Кавалёва.

З вялікай увагай быў праслуханы «Накцюрн» В. Андрэева ў выкананні Б. Мнацаканяна (скрыпка).

Апошнім на аглядзе выступіў выдатны калектыў музыкантаў у складзе выкладчыкаў музычнай школы, які выканаў рад твораў В. Андрэева.

В. ВОЙНАР,
З. ВАГЕР.

ПА СЛЯДАХ НАШЫХ ВЫСТУПЛЕННЯЎ

«Нявывучаная спадчына»

У заметцы пад такой назвай («Літаратура і мастацтва» № 42 за мінулы год) пісьменнік Ул. Дубоўка ўзнімаў пытанне аб навуковай спадчыне вядомага этнографа В. Н. Дабравольскага.

Як паведаміў рэдакцыі дырэктар Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору Акадэміі навук БССР акадэмік П. Ф. Глебка, навуковая спадчына В. Н. Дабравольскага «знойдзе шырокае адлюстраванне ў капітальным гістарычным даследаванні «Беларуская народная вуснапаэтычная творчасць», работу над якой калектыў аўтараў завершыць у канцы 1962 г.».

«Бабруйскія трутні»

Пра дармаедаў і спекулянтаў Сяргейчык і Казіміравa ішла гутарка ў артыкуле М. Беразінскага, змешчаным пад такой назвай у 84 нумары нашай газеты за мінулы год.

Выконваючы абавязкі начальніка аддзела міліцыі Бабруйскага райвыканкома тав. Таратун паведаміў рэдакцыі, што К. Сяргейчык атрымала пакаранне па суду, а Ул. Казіміраў працуе ў сучасны момант вучнем на заводзе.

Будні Віцебска

Пры Палацы культуры мясцовай прамысловасці Віцебскай вобласці створан харавы калектыў, якім кіруе самадзейны кампазітар В. Гарбатоўскі. Хор развучвае беларускую народную песню «Ой, рана на Івана», песню В. Гарбатоўскага «Нас кліча Ленін» і іншыя творы.



Вокладкі новых кніг, якія выйшлі ў Дзяржаўным выдавецтве БССР: «Салавей» **Зм. Бядулі** (пераклад на рускую мову П. Кабзарэўскага), «Я вярнуся жывы» **М. Крыо** (пераклад са славацкай мовы Я. Бяганскай), «Аб мастацкай прозе» **А. Кучара** і «Лань—рака лясная» **А. Шашкова.**

НА ТРЫ МЕСЯЦЫ — ДА ЦАЛІННІКАЎ

Белдзяржфілармонія накіравала брыгаду эстрадных артыстаў у Казахстан для абслугоўвання працоўных цалінных саўгасаў. У склад гэтай брыгады, якую ўзначальваюць Г. Бандарэўскі і З. Сысоева (канферанс), уваходзяць вакалісты Э. Міцуль і Л. Чарнарук, танцоры І. Карнейка і С. Кальчэўскі, акрабаты Т. і Э. Бязручанкі, артыст арыгінальнага жанра А. Нагайцаў і баяніст К. Шчаглоў.

Выканаўцы беларускай эстрады выехалі на цалінныя землі ў трохмесячную гастрольную паездку. За гэты час намечана даць 60 канцэртаў.

Канцэртная праграма Г. Бандарэўскага і З. Сысоевай разнастайная: у ёй многа твораў беларускіх пісьменнікаў і кампазітараў. Апрача канцэртаў, беларускія артысты правядуць з удзельнікамі мастацкай самадзейнасці цалінных саўгасаў творчыя кансультацыі і семінары.

Для працоўных Слуцка

Пяць творчых сустрэч народнага артыста Саюза ССР Я. Цікоцкага і заслужанага дзеяча мастацтва БССР М. Шнэйдармана наладзіў Саюз кампазітараў БССР з працоўнымі Слуцка.

Старшыня Саюза кампазітараў БССР Я. Цікоцкі расказаў слухачам аб развіцці беларускай прафесіянальнай музыкі, аб сваёй творчасці, аб працы Саюза кампазітараў.

Народны артыст БССР М. Дзяніса ў, заслужаная артыстка рэспублікі Т. Пастуніна, артыст Ю. Матраеў выканалі арыі з оперы Я. Цікоцкага «Дзяўчына з Палесся», яго песні і рамансы, шэраг вакальных твораў М. Шнэйдармана.

СЯМ'Я КНІГАЛЮБАЎ

Кніга трывала ўвайшла ў быт сельскіх працаўнікоў в. Упірава Іванаўскага раёна. Тут літаратуру чытае кожны пісьменны чалавек, стары і малы.

Паслугамі Упіраўскай сельскай бібліятэкі карыстаюцца звыш 500 чалавек, пераважна калгаснікі. Многа ў гэтай вёсцы кнігалюбаў.

Сем членаў сям'і калгасніка Сяргея Фёдаравіча Мазько — актыўныя чытачы сельскай бібліятэкі. Вось фармуляр Малько Івана Сяргеевіча. Сярод 50 кніг, якія прачытаў юнак за 1960 г., — творы Ул. І. Леніна, Шолахава, Фадзеева, Гюго, Драйзера і іншых аўтараў.

Васіль Сяргеевіч — вучань 10 класа, таксама актыўны чытач.

Самы старэйшы сын, Мікалай, былы танкіст, зусім нядаўна пачаў наведваць бібліятэку, але ўжо многа прачытаў кніг. Сярод іх — раманы «Крыніцы» І. Шамякіна, «І адзін у полі воін» Дольд-Міхайліка і інш.

Самыя малодшыя дзеці Сяргея Фёдаравіча — Антон, Аляксандра і Марыя займаюцца ў школе. І яны актыўныя чытачы сельскай бібліятэкі.

Моцна дружаць з кнігай у гэтай вялікай сям'і. Тут кожны чытае: і маці, і сам Сяргей Фёдаравіч, нягледзячы на свой узрост. Калі хто з сям'і ўзяў цікавую кнігу, то яе прачытаюць усе, а потым абмяркуюць на «сямейнай канферэнцыі».

Ёсць і свае прапагандысты кнігі. Аляксандра, вучаніца сёмага класа, мае пэўны ўчастак, на якім 10 калгаснікаў — пастаянныя чытачы яе перасоўнай бібліятэкі.

...Даўно апусціўся вячарні змрок на вёску. Хутка поўнач, але святло не гасне ў хаце Сяргея Фёдаравіча Мазько. Многія з членаў сям'і праводзяць вольны час за кнігай. За мінулы год гэтая сям'я прачытала каля 200 кніг.

М. ПЯТРОЎ.

У падарунак музею

Не так даўно маскоўскі мастак Уладзімір Багаткін прыслаў у Музей абароны Брэсцкай крэпасці 10 аўтаграфій. Гэта серыя гравюр аб незабыўных падзеях у гады Вялікай Айчыннай вайны.

Сярод іх работы «На подступах да Масквы», «Абарона Масквы. Панфілаўцы», «Парад 7 лістапада 1941 г.», «Расплата. 1941 г.». Глыбока хвалююць літаграфіі «Сустрэча двух фронтаў пад Ленінградам», «У наступленні».

У творах «Штурм рэйхстага», «Ля Брандэнбургскіх варот», «Берлін узяты», «Калона перамогі» раскрываецца апошні этап Вялікай Айчыннай вайны.

Некаторыя з названых работ экспануюцца ў музеі і выклікаюць цікавасць у наведвальнікаў. У бліжэйшы час уся серыя гравюр будзе выстаўлена ў зале, прысвечанай Вялікай Айчыннай вайне.

Л. КІСЯЛЁВА.

ШАХЦЁРЫ НАБЫВАЮЦЬ БЕЛАРУСКІЯ КНІГІ

Вялікую цікавасць праяўляюць да кніг беларускіх пісьменнікаў, перакладзеных на рускую і ўкраінскую мовы, жыхары шахцёрскага горада Красны Луч Луганскай вобласці. Многія з гарнякоў купляюць кнігі беларускіх пісьменнікаў. Праходчык Васіль Макараў набыў творы Янкі Купалы і Якуба Коласа. У яго асабістай бібліятэцы, якую ён збірае ўжо некалькі год ёсць творы Якуба Коласа, Янкі Купалы, Івана Шамякіна, Міхася Лынькова, Піліпа Пестрака, Янкі Брыля і многіх іншых беларускіх пісьменнікаў.

Добрая бібліятэка і ў рабочага забоя Івана Карзунова. У яго таксама ёсць творы беларускіх пісьменнікаў.

У мінулым годзе кнігагандлёвы магазін прадаў насельніцтву шахцёрскага горада каля пяці тысяч кніг беларускіх пісьменнікаў, перакладзеных на рускую і ўкраінскую мовы. Добра ідзе гандаль кнігамі і сёлета. Прададзена некалькі сот кніг беларускіх пісьменнікаў.

Ул. УЛАСЕНКА,
шахцёр.

Луганская вобласць.

Канцэрты самадзейных артыстаў

Удзельнікі самадзейнасці Лельчыцкага раённага Дома культуры часта выязджаюць з канцэртамі ў калгасы раёна. Днямі яны былі жаданымі гасцямі ў сельгасарцелі імя Леніна. Хор пад кіраўніцтвам О. Мазурэнкі выканаў песні «За мір і шчасце» самадзейнага кампазітара Гомельшчыны Гапонава, «Колькі ў небе зорак» самадзейнага кампазітара Гродзенскай вобласці Шыдлоўскага, рускую песню кампазітара Фляркоўскага «Прасторы раздолля» і інш. Вялікім поспехам у гледачоў карысталіся салісты Люда Стэльмах і Тамара Дамбоўская. Па-майстэрску чыталі вершы Міхаіл Шульга і Анастасся Жогла. Танцавальны калектыў пад кіраўніцтвам С. Анапрыйчука выканаў рускі танец «Вечар у вёсцы», жартоўны танец «Кухары» і інш.

Самадзейныя артысты падтрымліваюць творчыя сувязі з суседнімі раёнамі Украінскай ССР. Нядаўна лельчыцкія артысты выступілі з вялікай канцэртнай праграмай перад працоўнымі Славечанскага раёна. Цёпла віталі лельчыцкіх спевакоў і танцораў на сцэнах Жыткавіч, Турава, Ельска, Нароўлі і Петрыкава. У бліжэйшы час самадзейныя артысты выедуць у Тураў, Ельск, у вёскі свайго раёна.

Д. МАСЛАЎ.

ЗА ДАЎГАВЕЧНАСЦЬ ПЕСНІ

Адам Русак даўно працуе ў паэзіі. Многія яго творы, пакладзеныя на музыку, набылі папулярнасць. Сярод іх ёсць бясспрэчныя ўдачы і слабыя рэчы. Але паколькі аўтар — вядомы паэт-песеннік і ў пэўнай меры ўплывае на паэтычную моладзь, карысна высветліць, у чым яго сіла і слабасць. Гэта тым больш неабходна, што ў апошні час чуліся галасы ў абарону так званых «песенных тэкстаў», пазбаўленых усялякай мастацкай вартасці. Няма патрэбы даказваць, што падобныя сцвярджэнні на руку халтуршчыкам, якія гатовы запаланіць сваёй макулатурай і перыядычныя выданні, і эфір, і эстраду. Песня — масавы жанр. Яна даходзіць да найшырэйшай аўдыторыі. І калі словы нікчэмныя, ад гэтага мы будзем мець толькі шкоду. Здавалася б, ісціна простая, але на практыцы яе забываюць, і ў выніку да сённяшняга дня пас чатуюць вершаплётнымі практыкаваннямі. Дзіўная рэч! Вершы, забракаваныя ўсімі часопісамі і газетамі, з асаблівай ахвотай падхопліваюцца кампазітарамі.

Разгледзець вершы Адама Русака адасоблена ад музыкі надзвычай павучальна. Яны лішні раз сведчаць, што толькі сапраўдны, высокапаэтычны верш можа быць асновай змястоўнай песні.

У першых сваіх творах аўтар паэтызаваў «акорды», «міноры», «сілу маладую», што «выйшла... з песняй мая» і г. д. Беспрадметнае красамоўства, мнагаслоўнасць, неадчувальнасць вобразаў, характэрныя для вершаў «Зазвінелі струны», «Весканы плынь», «У даль», не гарманіравалі з канкрэтнымі праявамі жыцця і, вядома, не маглі стаць песнямі. Іх нецікава чытаць, не толькі спяваць. Яны занадта метафарычныя, неакрэсленыя па задуме.

У вершы «Выйду» (1932) паэт ужо робіць сур'ёзны крок наперад. Радок набывае ёмістасць, пругкасць, і хоць яшчэ ў асобных строфах «рассыпаюцца... радасці ўсмешкі», праз кніжную ўмоўнасць прарываюцца і дакладныя, запамінальныя радкі.

Праўда, аўтар неэканомны ў выбары слоў, ён без патрэбы вар'іруе адзін і той жа радок — «выйду ў поле на дарогу», «выйду ў поле пад дуброву», «хістае вецер нівы», «хіліць вецер ды калосці» і г. д. Мноства разоў упамінаюцца вецер, поле, нівы, што, бясспрэчна, засмечвае верш, пазбаўляе неабходнай энергіі і празрыстасці. Фальклорная стыхія захліствае паэтычны човен Адама Русака. Ён знаходзіцца ў палоне гатовага ўзору, не ўмее аддзяліць лепшае ад другараднага. Вонкавая арнаментальнасць падмяняе карціну. Аўтарская думка абяскрылена інертнасцю формы.

Праз чатыры гады пасля гэтага верша Адам Русак напісаў свой лепшы твор — «Бывайце здаровы» — цэласны па задуме, выверана і ўзважаны ў дэталях. Цеплыня новых чалавечых узаемаадносін, упэўненасць у заўтрашнім дні — усё гэта знайшло адлюстраванне ў вершы Адама Русака. Ён яскрава перадаў характэрныя нацыянальныя рысы беларусаў — гасціннасць, добразычлівасць, схільнасць да бяскрыўднага, тактоўнага жарту. Гэта, бясспрэчна, навеяна фальклорнымі матывамі.

Жадаем яшчэ вам
Прыбытку у хаце,
Ні мала, ні многа —
Штогод па дзіяці.

Не будзе вам крыўды
Яшчэ і за тое,
Калі пашанцуе
На год і па двое.

Тут ёсць неабходная гістарычная канкрэтнасць, якой не хапала папярэдняй творчасці паэта. Ён смела заяўляе: «У вашым калгасе шырокае поле», «кароў шмат і коней, свіней і авечак». І гэтым не зніжае гучання твора, а толькі надае яму пераканальнасць, жыццёвасць. Карціна, намаляваная аўтарам, адпавядала сапраўднасці, і не дзіўна, што яна прыйшлася да душы людзям. Народ зрабіў «Бывайце здаровы» адной з любімых песень, якая і сёння гучыць свежа і молада.

Многа часу прайшло, перш чым Адаму Русаку давялося зноў сустрэць творчую радасць. Скажам шчыра, што такія вершы, як «Выйдзі, выйдзі, дзеўчына...», «Як правёў мяне Цімох», «Як той Зосі давялося» — стылізацыя пад фальклор, перасыпаная охамі і ахамі; відаць, аўтар меркаваў, што падобныя воклічы перададуць адчуванне — «дзе мне радасць сваю дзеці». Паслухайце, як ненатуральна, непраўдзіва гучаць радкі:

Зося пісьмы напісала,
Сыноў бачыць пажадала,
І тут госці, нібы з грому,
На машынах коцяць к дому...
Восем хлопцаў — восем дзетак.
Восем кветачак-нявестак.

Мацярынская радасць, як і іншыя чалавечыя пачуцці, патрабуе стрыманасці ў выяўленні, бо глыбокае пачуццё немнагаслоўнае. І хоць аўтар не паскупіўся надзяліць усіх выгаднымі прафесіямі: Апанас — машыніст, Сцяпан — трактарыст, Аляксей — аграном, Мікалай — астраном, Анатоль — інжынер, Мацей — афіцэр, Янка — лётчык, Пятрусь — музыка, мы не бачым аблічча ніводнага з іх, нават вобраз самой маці кяўлоўны. Вядома, як можна ўявіць індывідуальныя рысы людзей, якія ўсе «малойцы», «грамацеі», якім прасцей простага па першаму пісьму маці прыкаціць (на машынах!) дадому... усім адразу.

Няўменне карыстацца фальклорам прыводзіла Адама Русака да паэтычных кур'ёзаў. Калгаснікі з верша «Дажынкі» гавораць так:

Добры вечар табе,
Старшыня-гаспадар!
Выйдзі к нам ды прымі
Працы нашае дар.

Што гэта — зварот прыгонных жнец да свайго пана? Калі паверыць аўтару, дык старшыня ў час уборкі ўраджаю сядзеў дома, чакаючы, пакуль яму прынясуць «дары». Завошта? Яго гнаць трэба з пасады, а не ўклончваць:

... Наладжвай нам баль
Ды музыкаў збірай,
Ты на славу цяпер
Нам дажынкі спраўляй.

Так пісаў Адам Русак аб калгасным жыцці ў 1938 г. Не дзіўна, што Вялікая Айчынная вайна пададзена ім у вобразах пералётных гусей і традыцыйных гвардзейцаў. Такія рэчы, як «Тры гвардзейцы», хутчэй напамінаюць песні часоў гайдамачыны, чым сучасныя творы. Дзяўчына, якая «доўга ў няволі» чакала збаўлення, паводзіць сябе так:

Аднаму прыслужыць (?!),
На другога гляне,
Трэцяму ўсміхнецца
Ласкаю вачэй. (?!)

Ні даць, ні ўзяць — прыехалі вусатыя малойцы сватаць чарнабровую казачку. Дзе тут атмасфера вайны? Дзе гнеў і боль людзей, змардаваных гітлераўскімі галаварэзамі?

Лінія фронта раздзяляе доўгі час многіх блізкіх людзей. Натуральна, што франтавікі пасылалі свае думы з хмарамі, з ветрам, з пералётнымі гусямі, — такая ўмоўнасць прыймальная як запеў. Але як лёгкадумна гучыць гэта ў Адама Русака:

Паляцелі птушкі,
Паляцелі гусі...

Зусім ясна, што такія крыхкія крылы не могуць падняць сур'ёзнай тэмы. Дзіва што! Паглядзіце на слоўнік паэта — воды, хвалі, плыні, крыгі, вецер, — усё гэта ў пераносным сэнсе? Ці можна ім перадаць трагізм кровапралітнейшай вайны? Зразумела, не. Гэта лішні раз пацвярджае думку, што фальклор можа быць выкарыстан толькі творча, што далёка не ўсе сучасныя паняцці можна выказаць пры дапамозе сродкаў народнай творчасці. Фальклор — не самамэта, а адзін з мастацкіх сродкаў. Ён ажыўляе твор тады, калі падпарадкаваны аўтарскай задуме, пераасэнсаваны ў адпаведнасці з надзённай патрэбай. Інакш ён застанецца мёртвым элементам, непатрэбным анахранізмам.

У Адама Русака трапляюцца вершы, якія, хоць і фальклорныя ў аснове, гучаць арыгінальна. Гэта — «Мяцеліца», «Па ваду дзяўчына ходзіць». Штрых за штрыхом выпісваецца вобраз дзяўчыны, добрай, увішнай калгасніцы, якая ўмее і папрацаваць хораша, і пагуляць весела:

Як вядзе жніярку ў полі, —
У рады снапы сцелюцца,
Жнеі глянуць ды гавораць:
«Не дзяўчына — мяцеліца».

Прыбяжыць на вечарынку —
Пяе, скача, вяселіцца,
Хлопцы глянуць ды гавораць:
«Не дзяўчына — мяцеліца».

І вось паэт робіць нечаканы паварот думкі, і рэч набывае новае гучанне:

А як пройдзе, як паглядзіць,
Як усмешкай падзеліцца —
Тваю душу, тваё сэрца
Ўміг закруціць мяцеліца.

З такой жа паэтычнай хітрынкай заканчваецца другі з названых вершаў:

Па ваду дзяўчына ходзіць,
Маці ў толк не дабярэ,
Што калодзеж той з вадою
У мілога на дварэ.

Трактарыст русавалосы,
Ці не чуеш ты бяды?
Ой, бяры дзяўчыну замуж,
Бо пакіне без вады.

Найбольшую вядомасць у пасляваенныя гады набыла «Лясная песня» паэта. Гэтаму, па-першае, садзейнічала таленавітая музыка Ул. Алоўнікава. Але і ў словах Адама Русака ёсць вартасць, якая, несумненна, зацікавіла кампазітара. Проста, без стылізацыі пад гатовыя ўзоры, паэт расказаў аб тым, чым абяссмерціў сябе беларускі народ, — аб партызанскай барацьбе.

Ой, бярозы ды сосны —
Партызанскія сёстры...

Гэтыя радкі глыбока асацыятыўныя, яны будзяць эмоцыі. Вядома, і «Лясная песня» выйграла б, калі б аўтар да канца пераадолеў умоўнасць.

Ды успомню пажары,
І варожыя хмары...

«Варожыя хмары» — вельмі прыблізнае азначэнне, асабліва таму, што ўмоўныя хмары суседнічаюць з рэальнымі падрабязнасцямі партызанскага быту — завеямі халодных снягоў, слотай, начнымі паходамі, кастрамі. Некаторыя радкі занадта абязлічаныя, вялыя: «толькі сэрцам пачую», «ты вялікі свабодны». Іх можна было насыціць большым зместам, большай дынамічнасцю. У цэлым жа «Лясная песня» — адно з найвышэйшых дасягненняў Адама Русака.

Па радыё часта можна пачуць песню «Дняпро» на словы Адама Русака. Шырокая, урачыстая музыка падкупляе слухача, але якое расчараванне спасцігае чалавека, калі ён чытае верш паэта. Як тут усё адвольна! Шаўчэнкаўскае «Реве та стогне Дніпр широкий» захапляе і без музыкі, мы адчуваем, што ні пра якую раку ў свеце так сказаць немагчыма. Там дадзена характэрная карціна, кожная дэталь дапамагае раскрыццю цэлага. А што мы маем у «Дняпры» Адама Русака?

Ой, Дняпро, ты наш родны,
любімы,
Казка нашых шумлівых лясоў,
Слава нашай квяцістай Радзімы,
Песня нашых шырокіх палёў.

«Казка... слава... песня» — паняцці, якія самі патрабуюць канкрэтызацыі. Як жа можна такімі словамі намаляваць карціну? Не было б нічога дзіўнага, калі б мы сказалі тое самае пра Амур, Іртыш і г. д. А як не па-песненнаму ўспрымаюцца радкі: «пра адважных сыноў пра сваіх», «на шырокі палетак на твой». Адкуль над нашым Дняпром быць «вяршыні горнай»? Якія «агні залатыя» могуць «чорныя вораны... згасіць»? «Жыватворчая вада», «спевы звонкія», «песня новая», «кіпучыя хвалі», «раўная пара», «зоры», «прасторы», «сады» і г. д. — усё гэта не змацавана паэтычнай думкай, рассыпаецца само па сабе. Неяк крыўдна робіцца, што пра цудоўнейшую раку беларускую напісана так дзяжурна, казённа, холадна. Вядома, такія бяскроўныя словы існуюць толькі за кошт музыкі. І ніякімі разважаннямі аб спецыфіцы песенных тэкстаў не ажывіць гэтых мёртвых радкоў.

Не раз адзначалася, што нашы паэты-песеннікі замардавалі сваіх дзівакаватых закаханых, бясконца водзячы іх па гаях, палях, лугах, не дазваляючы ім нават прысесці. Толькі ў адным вершы «Кажуць людзі» Адам Русак ухітрыўся да зморы наваадзіць сваіх герояў: «кажуць людзі, што Андрэйка часта ходзіць да мяне», «мы ж у поле толькі ходзім на работу разам з ім», «кажуць люд

МАЛОЕ БЯРЭ КНІГУ...

У новай кнізе Івана Муравейкі «Пра работу і ляноту» не цяжка знайсці добрыя, цікавыя, патрэбныя дзецям творы, такія, як аднайменная паэма, казка «У лесе дрымучым», вершы «Не затрымалася», «Сапраўдны гаспадар», «Лясныя дактары» і інш. Есць творы, якія могуць выклікаць пярэчанні і нават думку, што іх зусім не трэба змяшчаць у зборніку для малых, дзе творы павінны быць простыя, ясныя і цікавыя па задуме і вырашэнню. Іменна таму нам здаюцца зусім безгустоўнымі і непатрэбнымі ў зборніку такія вершы, у якіх расказваецца, што Ната «нешта ў носе даставала — ледзь-ледзь пальчык не зламала». Ці зусім нецікавы «Певень у ботах» або «Ці каменьчык ці цукерка?» На шчасце, такіх вершаў у кнізе нямнога і яны амаль незаўважныя побач з добрымі, цікавымі і патрэбнымі...

Аб апошніх і хочацца пагаварыць больш падрабязна.

Паэма «Пра работу і ляноту» вылучаецца ясным мэтанакіраваным сюжэтам, выразнай абмалёўкай персанажаў і цікавым вырашэннем галоўнага вобраза «раздуры, распусты, капрызы Янука».

Яго абувалі,
Яго разувалі,
Яго апраналі,
Яго распраналі,
Лішняга кроку
Ступіць не давалі...

Сюжэт паэмы не новы, тэма — таксама. Цікава другое. Паэт здолеў вырашыць тэму, так сказаць, у мініяцюры, даць рад яскравых малюнкаў героя ў розныя перыяды яго жыцця — ад дзіцяці да сталага чалавека. І трэба сказаць, што гэтыя малюнкі пераконваюць. Маленькі чытач надоўга запомніць лежабоку-гультая, што

Ляжыць цэлы дзень,
Да людзей не ідзе.

І няўмеку-недарэку, што, выйшаўшы на пакос, адно толькі і ведае —

Махае — аж пот па спіне,
па ілбе —
Не косіць каса, а па версе скубе.

Не атрымаўся з яго і качагар на электрастанцыі.

На лаўцы прылёг, каля самай
сцяны,
І ўбачыў адразу дзівосныя сны.

Гэтак жа даведваюцца дзеці, які стаўся з Янкі пекар, а потым — пажарнік. Апошняе выкліча ў іх немалыя кепікі і жарты, бо гэта ж дзіва, што

Пажар у пажарнай! Напэўна, ні
ў кога
Яшчэ не бывала здарэння такога.

Добрае пачуццё гумару і сур'ёзнае стаўленне да справы будзе выхоўваць у чытачоў гэтая паэма. Нямала падобных герояў яны знойдуць у жыцці, зробяць параўнанні, вывады, абагульненні. І гэта — галоўнае.

Лепшы твор у кнізе — казка «У лесе дрымучым». Асаблівасць яе ў тым, што тут шмат паэзіі, цёплага пачуцця да роднай прыроды, да яе жыхароў і пейзажаў. Шмат у казцы цудоўных апісанняў і карцін жыцця звяроў. Вандраванне героя па лесе ў пошуках каровы можна ўбачыць у многіх вядомых творах беларускіх пісьменнікаў, што пішуць для дзяцей. Назавём хоць бы В. Вітку. Але справа не ў гэтым. І. Муравейка здолеў знайсці свае сціплыя і даволі яркія фарбы ў абмалёўцы героя і жыхароў лесу.

Пастушок пагнаў пасвіць кароў, калі

Над ракой туман плыве.
Ззяюць іскры на траве —
То на кожную травінку
Палажыла ноч расінку,
Падарыў вясёлы дзень
Кожнай кропельцы прамень...

Гэтыя радкі навеюць шмат пачуццяў кожнаму малому, якое не пазбаўлена фантазіі і цікаўнасці. З неаслабнай увагай будзе сачыць яно за прыгодамі пастушка:

...здзівіўся
Наш бывалы пастушок, —
Не відаць у статку Лысай.
У які пабегла бок?
Мо' ляжыць дзе за кустамі
І ваюе з аваднямі,
Ці у той забегла хвойнік,
Дзе жыве лясны разбойнік?

Чытач заінтрыгаваны. Што ж будзе далей? І пісьменнік не злоўжывае цікаўнасцю маленькіх чытачоў. Разам з героем ён прымушае яго знаёміцца са звычкамі, паводзінамі звяроў.

Васілёк і сам добра ведае лясное жыццё. Таму ён зусім не губляецца пры нечаканых сустрэчах з лясными жыхарамі. Вожыка пачаставаў забітай змяёй, вавёрцы дапамог уцягнуць у дупло мяшок з сушанымі грыбамі, малых медзведзянят пачаставаў мёдам. Гэта з боку жывёл выклікае ўдзячнасць і гатоўнасць дапамагчы Васільку ў пошуках Лысай. Найбольшую гатоўнасць выказаў стары Мядзведзь:

Топ-топ-топ—бяжыць Мядзведзь,
Каб паспець, паспець, паспець...
— Воўк жыве каля балота,
Апярэдзім жываглота.

Мядзведзь выступае ў казцы справядлівым і чэсным гаспадаром лесу. За тое, што Воўк не выконваў загаду,

Узяла Мядзведзя злосць!
—Ах ты воўчая ты косць!
Ды як ляпне Ваўка ў бок —
Назаўсёды Воўк замоўк.

Уся паэма прасякнута чыстай паэзіяй прыроды, жаданнем выклікаць у маленькага чытача добрую думку, што ў жыцці мае права на існаванне толькі добрае і што добрае трэба рабіць усюды і ўсім.

І яшчэ. Нават самы дужы не можа справіцца са складанай справай. Грамада, калектыў не толькі выхоўваюць чалавека, але і любую справу могуць зрушыць з месца. Гэта ілюструецца ў канцы паэмы, дзе матыў вядомай казкі пра рэпку ўдала ўплецены ў агульную тканіну паэмы таму, што мае сваё цікавае і арыгінальнае вырашэнне.

Адным словам, можна ўпэўнена сказаць, што казка «У лесе дрымучым» спадабаецца дзецям.

З вершаў асабліва ўдаліся паэту павучальныя: «Сапраўдны гаспадар» — аб тым, як маленькі Косцік збудаваў мосцік праз канаву; «Лясныя дактары» — пра «Знакамітых дактароў» — лясных дзятлоў, што выратавалі дрэва ад караедаў; «Не затрымалася» — пра дзяўчынку Танечку, што прабадзялася цэлы дзень і забыла выканаць мамчыну просьбу.

Добра, што Іван Муравейка вядзе размову з дзецьмі, як роўны з роўнымі: адкрыта, шчыра, нідзе не падрабляючыся пад «сюсюканне».

Паэт, на жаль, не заўсёды ўдумліва і патрабавальна ставіцца да выбару тэмы і яе вырашэння. Творы для дзяцей павінны несці вялікую сэнсавую і эмацыянальную нагрузку.

На нашу думку, удалыя малюнкі Ю. Пучынскага да паэмы «Пра работу і ляноту» і да казкі «У лесе дрымучым». Яны дапамагаюць чытачу бачыць яскравей і глыбей герояў твора. Добра перадаюць стан персанажаў малюнкі да такіх вершаў, як «Дружная сямейка», «Тэлефон». Але ёсць і мала выразныя, можна сказаць, «дзяжурныя» малюнкі да такіх вершаў, як «Няўжо вясна?», «Колеры года» і інш.

І. ПАЎЛЮКОЎСКІ.

ЛІТАРАТУРА ДА ВЫБАРАЎ

У мэтах лепшай прапаганды літаратуры да выбараў у мясцовыя Саветы дэпутатаў працоўных у Тураўскай раённай бібліятэцы афармлена кніжная вітрына. На ёй артыкулы Ул. І. Леніна аб савецкай сацыялістычнай дэмакратыі, аб савецкім будаўніцтве, зборнік дакументаў КПСС аб рабоце Саветаў. Вялікае месца на вітрыне займае літаратура аб перавазе савецкай дэмакратыі над буржуазнай, аб правах і абавязках савецкіх грамадзян, аб савецкай выбарчай сістэме.

Бібліятэка рыхтуе вечар маладых выбаршчыкаў.

Будні Віцебска

Тэатр імя Якуба Коласа даўно і трывала сябруе з калгаснікамі. Яны сталыя і прыхільныя гледачы спектакляў коласаўцаў. Не знойдзецца амаль ніводнага населенага пункта на Віцебшчыне, жыхары якога не бачылі б пастановак тэатра.

Вось і «Лявоніха» П. Данілава (рэжысёр Ю. Шчарбакоў, мастак Я. Нікалаеў, кампазітар І. Любан, балетмайстар Янка Хвораст) прыцягнула ўвагу сялян мастацкай праўдай пра мінуўшчыну Беларусі, героіка-рамантычнай тэатральнасцю, яркімі і пераканальнымі сцэнічнымі характарамі.

Нядаўна тэатр паказаў прэм'еру «Заводскія хлопцы». Гэтая лірычная камедыя І. Шура апавядае аб савецкіх юнаках і дзяўчатах, іх дружбе і каханні, высакароднасці і чыстым сумленні (рэжысёр Ю. Собалеў, мастак Н. Іванова, музыка з твораў Чайкоўскага).

Асноўныя выканаўцы ролей — моладзь.

Ігара іграе М. Шалутка, Мішу — Ф. Марцынкевіч, Сяргу — Е. Шабан, Галю — А. Яленская, Таню — А. Смагіна, Тамару — Л. Куцькіна, Кузяўкіна — С. Кохан.

Побач з моладдзю з поспехам выступаюць сталыя майстры сцэны — М. Звездачотаў (урач Крупін), Е. Мацісава (хірург Анісава), М. Бялінская (маці Ігара).

НА ЗДЫМКАХ: 1) Выканаўцы галоўных ролей у «Лявоніхе» Ц. СЯРГЕЙЧЫК, З. КАНАПЕЛЬКА, Г. ГАРБУК і Л. КУЦЬКІНА гутараць пасля спектакля з гледачамі-калгаснікамі Лёзненскага раёна.

2) артыстка Г. МАРКІНА ў ролі Шуры і артыст О. ЛАПО ў ролі Вані («Заводскія хлопцы»).

Фота Ул. КРУКА.

НАВІНЫ КУЛЬТУРЫ

Калгасны музей

Па ініцыятыве Віцебскага абласнога Дома народнай творчасці і краязнаўчага музея ў калгасе «Новы будаўнік» Лепельскага раёна створан мастацкі музей.

Народныя ўмельцы і самадзейныя жывапісцы перадалі новаму сельскаму музею каля 50 твораў.

Музею перадалі экспанаты таксама і прафесіянальныя аўтары. Так, напрыклад, А. Каржанеўскі перадаў кампазіцыю «Віцебск. Плошча імя Леніна», П. Явіч—карціну «Маладая ткачыха», В. Кухараў — свой твор «Калгасніца», А. Таўкач—«Зімовы пейзаж».

Новы рэпертуар

Народныя тэатры і драматычныя калектывы пасля рэспубліканскага агляду пачалі працу над новым рэпертуарам.

Так, напрыклад, самадзейныя артысты Талачынскага раённага Дома культуры паказалі спектакль «Каралёўскі гамбіт» па п'есе Я. Васілёнка.

Бліжэйшыя прэм'еры: у Багушэўскім народным тэатры — «Чалавек вярнуўся» П. Васілеўскага, у Аршанскім народным тэатры — «Разлом» Б. Лаўранёва. Віцебскі народны тэатр мае намер паставіць п'есу А. Арбузава «Горад на досвітку».

Гэта адбудзецца ў сакавіку

Свае лепшыя спектаклі ўпершыню пакажа ў Віцебску Пастаўскі народны тэатр (на сцэне і па тэлебачанню).

* * *

Самадзейныя кампазітары Віцебшчыны сустрэнуцца для таварыскай творчай размовы ў сваім абласным цэнтры з прадстаўнікамі рэспубліканскага Саюза кампазітараў. Будуць абмеркаваны новыя песні і п'есы іншых жанраў.

* * *

У мэтах паляпшэння эстэтычнага выхавання моладзі ў Віцебску праводзіцца дзесяцідзённы семінар клубных масавікоў-зацейнікаў.

* * *

У Смаленску і Віцебску арганізоўваюцца абменныя канцэрты самадзейных калектываў і салістаў Віцебшчыны і Смаленшчыны. Нашы аматары выканаюць беларускія песні, танцы і інструментальныя творы.

Абменныя паказы становяцца плённай традыцыяй. Так, напрыклад, у мінулым годзе смаленцы вельмі гасцінна сустрэлі спектакль «Паўлінку» Янкі Купалы ў выкананні самадзейных артыстаў Віцебскага народнага тэатра Дома культуры мясцовай прамысловасці.

Наш кар.

Віцебск.

ПІСЬМЫ Ў РЭДАКЦЫЮ

Няўвага да моладзі

Пры многіх рэдакцыях раённых, гарадскіх, шматтыражных газет створаны літаратурныя аб'яднанні. Пачынаючыя пісьменнікі, паэты на пасяджэннях аб'яднанняў абмяркоўваюць свае новыя творы, лепшыя з іх затым змяшчаюцца ў літаратурных старонках газет.

У нашым жа Івацэвіцкім раёне пры газеце «Зара камунізма» да гэтага часу не створана літаратурнае аб'яднанне. У выніку літаратурныя старонкі ў газеце — вельмі рэдкая з'ява. Прывяду такі прыклад. Літаратурная старонка ў нашай газеце была надрукавана 31 жніўня 1958 г., дзе былі змешчаны вершы, гумарэскі і замалёўкі маладых аўтараў Міхася Шавеля, Міколы Радзюка, Уладзіміра Харужага, Фёдара Хаванскага, Сяргея Зуева і інш. А наступная літаратурная старонка выйшла... аж праз два з лішнім гады, 24 снежня 1960 г.! Здзіўляе яшчэ і тое, што яна складаецца ў асноўным з твораў тых аўтараў, якія працуюць у іншых раёнах нашай вобласці. Напрыклад, Мікалай Чарняеў працуе ў рэдакцыі бярозаўскай раённай газеты «Пламя», Яраслаў Пархута працуе адказным сакратаром ружанскай раённай газеты «Запаветы Леніна». І зазначым, што большая палова літстаронкі занята іх творамі. А дзе ж месца для рабочых і сельскіх пачынаючых аўтараў? Яго чамусьці не знаходзіць наша газета.

На літаратурныя творы, якія дасылаеш у газету, адказу ніколі не атрымліваеш. А калі прыйдзеш у рэдакцыю газеты, дык аказваецца, што тав. Банасевіч — адказны сакратар — іх ужо згубіў. Летась мне давялося зайсці ў рэдакцыю даведацца пра лёс свайго матэрыялу. Замест шчырай сяброўскай размовы супрацоўніца газеты — загадчык аддзела пісем тав. Арлова толькі сказала адно, што прыпеўкі, напісаныя мной, благія. Сапраўды, ад такога адказу на душы робіцца дрэнна і пісаць далей адпадае ахвота.

Пачынаючыя аўтары раёна мала супрацоўнічаюць у раённай газеце. Забыліся тут і пра сатырычны аддзел «Наш вожык», які раней хоць і рэдка, але выпускаўся.

Трэба, каб рэдакцыя больш прыцягвала пачынаючых аўтараў да ўдзелу ў газеце.

Іван МАКАРЭВІЧ.

Аднавіць былую славу

Зусім нядаўна ў гуртках мастацкай самадзейнасці саўгаса «Доктаравічы» праводзілася цікавая творчая работа. Самадзейныя артысты выступалі з разнастайнай праграмай у вёсках Доктаравічы, Вуглы, Гарнастаева, Ужы, на цэнтральнай сядзібе саўгаса.

У мінулым годзе калектыў мастацкай самадзейнасці трыццаць разоў выязджаў у населеныя пункты раёна. Зводны хор удзельнічаў у свяце песні на возеры Нарач, выступаў у Капылі. На раённым агляде гурткоў мастацкай самадзейнасці ён заняў першае месца. Па конкурсу хор прайшоў на абласны агляд народных талентаў. Але самадзейныя артысты ў Мінск не трапілі, бо адміністрацыя саўгаса і рабочком не паклапаціліся для іх набыць касцюмы. Толькі асобным выканаўцам пашчасціла выступіць на сталічнай сцэне. На рэспубліканскім агляде Яўген Шлагінаў па-майстэрску прачытаў урывак з паэмы Маякоўскага «Уладзімір Ільіч Ленін» і быў узнагароджан граматай Міністэрства культуры БССР.

Паступова творчае жыццё ў самадзейным калектыве пачало замірацца. Сігналы аб гэтым сталі паступаць у рабочком саўгаса. Здавалася б, што камісія па культурна-масавай рабоце і яе старшыня тав. Сіцкі павінны былі прыняць усе меры, каб наладзіць работу гурткоў. Але гэтага не здарылася.

Кіраўніцтва мастацкай самадзейнасцю рабочком перадаручыў аднаму старшыні савета клуба тав. Волкаву, які, дарэчы, нёс адказнасць і за фізкультурную работу. Справіцца з такімі абавязкамі ён не здолеў. І нядаўна падаў заяву аб вызваленні ад пасады, якую займаў.

У апошні час адмовіўся працаваць з духавым аркестрам саўгаса і тав. Карпук. Ён кіраваў ім на грамадскіх пачатках. Штатнага ж кіраўніка аркестра ў саўгасным клубе, відаць, яе прадугледжана.

Бываюць выпадкі, калі асобныя кіруючыя работнікі саўгаса зусім не лічацца з культурнымі запатрабаваннямі рабочых. Напрыклад, упраўляючы аддзялення Доктаравічы тав. Даўгаполаў распарадзіўся засыпаць сельскі клуб збожжам. У вёсцы Вуглы толькі па патрабаванню рабочых з клубных памяшканняў забралі збожжа.

Прыведзеныя факты сведчаць, што культурна-масавая работа ў саўгасе «Доктаравічы» пушчана на самацёк. Дзіўную пазіцыю ў гэтай справе займае раённы аддзел культуры, які не прымае мер, каб аднавіць былую славу самадзейнага калектыву.

А. САВЕЛЬЕЎ.

Капыльскі раён.

Сувязі пісьменнікаў з воінамі

У кабінеце праўлення Саюза пісьменнікаў БССР красуецца кубак — ганаровая ўзнагарода беларускім пісьменнікам ад Мінскага акруговага Дома афіцэраў імя К. Я. Варашылава за актыўную ваенна-шэфскую работу. Камандуючы Беларускай ваеннай акругі т. Камароў узнагародзіў пісьменніцкую арганізацыю рэспублікі Ганаровай граматай. Такой жа граматай узнагароджаны пісьменнікі П. Броўка, І. Шамякін і М. Аляксеў. Цэнтральны камітэт прафсаюза работнікаў культуры СССР нядаўна прыслаў з Масквы 27 пісьменнікам свае граматы з падзякаю.

У пісьменнікаў Беларусі яшчэ з даўніх часоў традыцыйныя моцныя сувязі з воінскімі часцямі. Пры Саюзе пісьменнікаў БССР створана камісія па ваеннамастацкай літаратуры, якую ўзначальвае пісьменнік, генерал-маёр М. Аляксееў. У склад яе ўваходзяць пісьменнікі І. Мележ, А. Кулакоўскі, паэты П. Прыходзька, А. Лазнявы і інш.

За два мінулыя гады праўленне Саюза пісьменнікаў у кантакце з Палітупраўленнем акругі арганізавалі ў часцях БВА да 200 выступленняў пісьменнікаў і паэтаў Беларусі. Перад воінамі акругі з чытаннем сваіх твораў і гутаркамі выступалі П. Броўка, І. Шамякін, М. Лынькоў, М. Калачынскі, М. Танк, М. Ткачоў, І. Мележ, А. Кулакоўскі, М. Аляксееў, П. Прыходзька, А. Лазнявы, Я. Садоўскі і іншыя літаратары. Усе выступленні былі прасякнуты адной галоўнай тэмай — вучыцеся ў герояў Айчыннай вайны, павышайце свае маральна-баявыя якасці!

У акрузе—рад літаратурных аб'яднанняў, якія ахопліваюць 210 пачынаючых аўтараў. Да ўсіх аб'яднанняў прымацаваны для дапамогі кваліфікаваныя пісьменнікі і паэты Беларусі. Гэта ў немалой ступені садзейнічала таму, што Беларускае дзяржаўнае выдавецтва нядаўна выпусціла зборнік мастацкіх твораў салдат і афіцэраў акругі. Па добрай традыцыі пісьменнікі Беларусі прымаюць удзел у прапагандзе ваеннай кнігі і ў дні «Тыдня ваеннай кнігі» ахвотна выязджаюць у воінскія часці. Цяпер у Беларусі пачалася падрыхтоўка да азнаменавання ў чэрвені 1961 г. 20-годдзя гераічнай абароны Брэсцкай крэпасці.

У Брэсце і Мінску з удзелам майстроў мастацкага слова наладжваюцца вялікія вечары, на якіх з чытаннем новых твораў аб героях абароны выступаюць паэты, празаікі рэспублікі. Шмат цікавых масавых мерапрыемстваў намечана Саюзам пісьменнікаў і ў гонар 43-й гадавіны Савецкай Арміі і Ваенна-Марскога Флоту.

Пісьменнікі зноў пабываюць у гасцях у воінаў, а 19 лютага ў Доме афіцэраў адбудзецца масавы літаратурны вечар для сталічнага гарнізона.

Выдаць зборнік-дэкламатар

— Дзе ўзяць цікавыя творы для чытання з эстрады? — часта можна пачуць ад работнікаў раённых дамоў культуры і кіраўнікоў мастацкай самадзейнасці, ад шматлікіх аматараў-чытальнікаў. І сапраўды, патрэба ў матэрыяле для мастацкага чытання вельмі вялікая, асабліва сярод самадзейных артыстаў.

Здавалася б, варта толькі пагартаць некалькі нумароў часопісаў «Полымя», «Маладосць», газет «Звязда» ці «Чырвоная змена», як адразу знойдуцца творы для мастацкага чытання перад шырокай аўдыторыяй. На самай жа справе гэта не зусім так.

Безумоўна, у нашым перыядычным друку — многа высокамастацкіх літаратурных твораў. Але не ўсе яны могуць быць прачытаны са сцэны, не ўсе могуць задаволіць слухачоў і чытальнікаў. Чаму? Таму, што твор, які чытаецца на эстрадзе, павінен быць вельмі зразумелым, без лішніх і цяжкіх сказаў; твор, які самі выканаўцы-дэкламатары могуць адобрыць, ведаючы з асабістага вопыту, што можа зацікавіць слухача, а што — не. Колькі трэба патраціць часу і намаганняў, каб знайсці для канцэртнай праграмы літаратурныя нумары (вершы, байкі, апавяданні, фельетоны і г. д.)! Белдзяржвыдавецтва магло б дапамагчы самадзейным артыстам — сабраць адпаведныя творы для дэкламацыі і выдаць іх асобным зборнікам. Трэба толькі складальніку такога зборніка сур'ёзна паставіцца да выбару мастацкіх твораў, а не проста запоўніць старонкі выпадковымі рэчамі. Дарэчы, у падборы і складанні літаратурных матэрыялаў могуць удзельнічаць некалькі аўтараў, што пойдзе на карысць справы.

Зборніка-дэкламатара з нецярплівасцю чакаюць шматлікія самадзейныя і прафесіянальныя артысты. Слова за выдавецтвам.

З. БІРАЛА,
настаўнік.

РАНІЦА

Іван МЕЛЕЖ.

Іван Мележ закончыў працу над новым раманам «Людзі на балоце» — аб першых гадах Савецкай улады на Палессі.

Друкуем урывак з рамана, які поўнасцю будзе апублікаваны ў часопісе «Полымя».

Калёсы, на якіх сядзелі Васіль і маці, ужо ўязджалі ў лес. Пасля поля тут ад гушчыні маўклівых, нібы прытоеных хмурых хваін было цемнавата і вільготна, хоць лясок і рос на пясчаніку. Промні сонца, што чырвонілі хвойнік угары, яшчэ не маглі прабіцца да нізу, да зямлі, і на рэдкай траве тут мутна трымалася раса, а на пяску значыліся вільготныя цемнаватыя плямы. Не зважаючы на расу і вільгаць, адчувалася ўжо набліжэнне дзённай задухі.

— Душна будзе,—сказала маці.

Неўзабаве яны дагналі Чарнушкаў. Можна было б ехаць за імі, аддаючы знак пашаны дзядзьку Цімоху, як старэйшаму, і можа ў іншых абставінах Васіль так і зрабіў бы, але побач з дзядзькам сядзела задзіра Гануля, яго дачка, Васілёва равесніца, якая ў апошні час Васілю проста жыць не давала, пры кожнай сустрэчы, дзе б ні трапіўся ёй—смяялася ці нават здзекавалася з яго. От жа толькі пазаўчора пры ўсіх абсмяяла. «Васіль, а чаму гэта ў цябе вочы не адзінакія — адно, як вада, светлае, а другое — як жалудок! І ў розныя бакі глядзяць!.. І валасы ўнь — ззаду як не чорныя, а спераду — рудзенькія! Як у цяляці рабога». Стаяла і рагатала пры ўсіх! Каб не праўду казала, яшчэ б нішто: а то ж праўда ўсё—розныя вочы, як на грэх, і косыя трохі, і валасы ад сонца наперадзе зарудзеліся. Усё нялюдскае нейкае!..

Ці ж мог пасля ўсяго гэтага Васіль паслухмяна цягнуцца за Чарнушкамі? Ледзь маці ўправілася сказаць дзядзьку Цімоху, што, мусіць, будзе задуха, як Васіль, тузануўшы «Гуза» лейцамі, чапляючы калёсамі за нізкае галлё падлеску, порстка аб'ехаў Чарнушкаў, пакінуў ззаду. Ён знарок не паглядзеў на Ганну, але і не пазіраючы на яе, Васіль адчуваў сябе шчаслівым. Вось як ён «абступіў» яе, гэту задзіру!

Тут, калі Васіль быў увесь напоўнен слодыччу адплаты, ён заўважыў, што стары, вельмі пацёрты хамут разышоўся і аглобля зашоргала па рудых «Гузавых» нагах. Васіль саскочыў. Нічога страшнага не было: проста парвалася супоня.

Васіль хутчэй звязаў парваныя канцы, але калі паспрабаваў, пацягнуўшы з усяе сілы, моц вузелка, той разышоўся. Прыйшлося зноў звязаць. Калі, паружавеўшы ад натугі, сцягваў супоню на хамуце, побач зарыпелі калёсы дзядзькі Цімоха.

— Што такое?

— Супоня... з-зараза...

Гануля весела зіркнула.

— Ён... супоню дома забыў!

Калёсы дзядзькі Цімоха, а на іх і дзядзька Хведзька і задаволеная Гануля, прайшлі паўз Васіля і сталі пакрыху аддаляцца.

— Ну, ты знаеш!..

Васіль не адразу знайшоў, што адказаць.

— У чужое проса не ўтыкай носа!..

Ён сказаў гэтыя словы ціха, больш для сябе, каб супакоіцца. І наогул, хіба добра было б яму, няхай і маладому чалавеку, але ж мужчыне і гаспадару—старшаму ў сям'і, звязвацца з нейкай дзяўчынкай. Але ні словы, ні думкі гэтыя не вярталі яму спакою і раўнавагі.

Васіль ехаў цяпер пануры, паглыблены ў свае думкі. Ён наогул быў чалавек, схільны да развагі, не любіў вельмі адкрываць сваю душу, асабліва, калі ў ёй варушыліся думкі невясёлыя і нядобрыя. Пахістваючыся, крыху горбячыся, хмурачы яшчэ дзіцячы лоб, ён міжвольна прыгадваў, дзе і калі яна казала што-небудзь крыўднае, думаў, як аддзявыць ёй. У думкі гэтыя ўпляліся іншыя — спачатку пра старую, патлелую ў зямлі супоню, стары хамут, потым пра небараку «Гуза», якога калісьці кінулі балахоўцы, не маючы на яго, мусіць, ніякай надзеі. І праўда ж, конь тады дадыхаў і не было веры, што ён яшчэ ўстане на ногі, —колькі з ім папаважаліся, каб падняць зноў. Ён устаў, але як няпэўна ходзяць па зямлі слабыя яго ногі. А што ж з яго карысці, з такога каня, які не мае сілы!

Калі б быў у Васіля хоць бы такі канёк, як у Чарнушкі. Таксама не бог ведае што, не раўня таму, якога прывёў стары Корч з мазырскага кірмашу зімою, а ўсё-такі конь як конь.

Дарога пачала паніжацца, і сыпкі пясок яе змяніўся мяккім, падатным забалочаным грунтам, на якім вырэзваліся дзве чорныя вільготныя каляіны. У каляінах часта віднеліся вылузганыя жылы карнявішчаў, было многа ям, і калёсы амаль увесь час падскоквалі, моцна хісталіся з боку на бок. Камлі дрэваў часам сунуліся паўз самыя драбінкі. І маці была цяпер у возе. Васіль жа сядзеў па-ранейшаму на драбінцы, час ад часу, нібы ў гульні, перакідваючы ногі ў воз.

Турботы было не толькі нагам, але і рукам: вакол хмарамі звінелі, апаноўвалі асатанелыя камары, амаль безупынна даводзілася адбівацца ад іх. Маці закрыла хусткай ледзь не ўвесь твар, падкурчыла ногі, але ратунку і так не было. Камарэва даставала цераз вопратку, залазіла ў рукавы, за каўнер.

«Гуз» адбіваўся, адбіваўся хвастом, галавой, не вытрываў, патрухаў уподбег. Але гэта не памагло, і ён зноў пайшоў — круціў хвастом, матляў грывай, стрыг вушамі...

Лес тут быў зусім іншы, як на пясчаніку. Рослыя, з чорнымі, быццам абпаленымі, камлямі, з дзіўна паточанай карой, старыя алешыны танулі знізу ў густым балотным разнатраўі, у маладой пораслі алешын, у гнілым асклізлым ламаччы. Алешнік вельмі часта мяшаўся з лазняком, што рос моцнымі дружнымі купамі, уздымаючы ў лясны прыцемак шызыя кучары пераплеценага галля. У вечна цёмных і вільготных зарасніках яго на чорнай гнілі балота цэлымі агіднымі клубкамі кішэлі, звіваліся слізкія гадзюкі.

У лесе буяла мноства злой, пякучай лясной крапівы, што дзе-нідзе парасла ў чалавечы рост. «Глядзі ты, колькі выперлася яе, етай поскудзі!— мімаволі праплыло ў галаве Васіля. — І якая — як каноплі!..»

З-за лавароту ён зноў убачыў наперадзе Чарнушкавы калёсы, белую Ганніну хустачку, і думкі яго вярнуліся к дзяўчыне: «Я етага табе не забуду! Пабачыш!»

* * *

Калі Васіль пад'ехаў да сенажаці, Чарнушка ўжо выводзіў з аглабель распрэжанага каня. Хведзька, прысеўшы наўколенцы, штосьці зацікаўлена разглядаў у траве, а Ганна перакладвала пад калёсы біклажку з вадою. Васіль знарок адвярнуўся, каб не глядзець у яе бок, але міма яго ўвагі ўсё ж не прайшло ні тое, што яна рабіла, ні тое, як зірнула на яго. Зірнула з усмешачкай, і Васілю здалося, што з яе язычка сарвецца штосьці кплівае, крыўднае.

Яна прамаўчала.

— Васіль, а мо' тут станем?—прамовіла маці.— Разам з імі. Мясцінка, глядзі, якая...

Надзелы Чарнушкаў і Васілёвай маці былі побач. Васіль у іншы час так і зрабіў бы, як казала маці, — гэта было зручна і выгадна: спакайней было б і за коней, і за калёсы, за якімі назіралі б і Чарнушкі. Але сёння сын панура заўпарціўся:

— Мясцінка як мясцінка...

Ён суняў каня падалей, крокаў праз трыццаць, за кустом маладога арэшніку. Тут Васіль азірнуўся, акінуў позіркам даволі вялікае, акружанае з усіх бакоў лесам балота. На балоце там і тут шыза кучаравіліся кусты лазы, якія дзе-нідзе зрасталіся ў цэлыя астраўкі. Але Васіль не даў ніякай увагі гэтым астраўкам, яго больш зацікавіла, што на балоце яшчэ было многа вады, часам цэлыя разводдзі. Вада была і на яго надзеле. «Чорт бы яе пабраў», — аж мацюкнуўся ў думках Васіль.

Пры ўзлесках амаль усюды стаялі калёсы, завіхаліся людзі. Нямала людзей было і на балоце,—ужо дзе-нідзе касілі.

Стрыножыўшы «Гуза», Васіль пусціў яго пасвіцца, вярнуўся к калёсам і выцягнуў касу. Ён развязаў анучку, абгорнутую вакол кажа касы, і, ускінуўшы касу на плячо, перапоўнены гонарам, стрымана, паважна падаўся да сенажаці.

Маці, маўклівая і паслухмяная, пайшла ўслед за ім.

— Тут. Нашае — адсюль і дасюль, — сказала яна.

Яна магла б і не гаварыць гэтага, бо Васіль і сам ведаў іх надзел, — відаць, ёй проста было няёмка стаяць каля яго. Васіль заўважыў на яе твары, у складцы родных губ, выраз нейкага шкадавання і вінаватасці і строга прамовіў:

— Ведаю.

Уваткнуўшы востры канец касся ў мяккую зямлю, трымаючы моцна рукой другі край, дзе пятка касы была ўвязана лазовым дубцом, Васіль стаў мянташыць. Адмахнуўшыся ад камароў, коса зірнуўшы ў бок Чарнушкаў, убачыў, што Цімох яшчэ корпаецца каля воза, і задаволена падумаў, што пачынае раней.

Расставіўшы па-мужчынску ногі, упінаючыся пяткамі ў грунт, ён размашыста правёў касой — і трава шыркнула, паслухмяна лягла злева акуратным радком. Ён правёў у другі раз, у трэці, трава злева стала выцягвацца ў вільготны зялёны рад. Хутка ногі яго ступілі на пожню, перад ім быў ужо лапік чыстага, скошанага ім. Хто гэта казаў, што ён яшчэ зялёны касіць? Што яму быццам кашы яшчэ многа трэба! Кашы, можа, камунебудзь і трэба, толькі яшчэ не вядома—каму. Але не яму, не Васілю. Праўду кажуць, што касіць— справа не абы якая, мужчынская справа, тут трэба і сілу, і спрыт, умець трэба. Але ў Васіля ўсё гэта ёсць. Глядзіце, як ладна шыркае ў яго каса, як кладзецца, даўжэе рад!

«Ш-шырк, ш-шырк», — згодна прамаўляла ў лад Васілёвым думкам каса.

Ён адчуваў, што ззаду стаіць маці, пазірае ўслед, ласкавая і гордая, і ад гэтага ў руках і нагах сілы быццам большала. І разам з маці, акрамя яе, ён адчуваў за спіной яшчэ адну істоту, зусім іншую, чым маці, кплівую і нядобрую, якая, можа быць, таксама сочыць за ім сваім падсцярожлівым позіркам. Што ж, няхай сочыць, яму гэта ніяк не абыходзіць!

Васіль заўважыў, што дзядзька Цімох таксама пачаў павольна, мерна махаць касою. Ён ідзе паціху, крыху горбячыся. Васіль таксама крыху прыгорбіўся—так ходзяць усе сталыя людзі; убачыўшы, як дзядзька ідзе, успомніў, што галоўнае пры касьбе — не спяшацца, не высільвацца, каб не змарыцца да пары.

Задумаўся, не асцярогся, і каса знянацку з усяго маху ўрэзалася ў нешта цвёрдае. Купіна, каб яна правалілася! Васіль хутчэй выцягнуў касу і скоса зірнуў у бок Чарнушкі, — ці не заўважылі.

— Што там, Вась? — адгукнулася маці.

— Нічога.

Ён сказаў рэзка, незадаволена, спагнаў на ёй прыкрасць. Няхай не крыўдзіцца, няма чаго стаяць ды глядзець, калі чалавек заняты!

Маці нібы здагадалася пра яго думкі.

— Я пайду к каню... Памагай табе бог!

Яна перахрысціла яго, блаславіла і, уздыхнуўшы, пайшла к калёсам. Васіль, не нагінаючыся, каб не паказваць, быццам нешта здарылася, агледзеў касу і супакоіўся. Каса была цэлая. Ён зноў правёў па траве, каса ішла добра, як і раней. Касіў ён цяпер асцярожней, сачыў за куп'ём, якое пачынала трапляцца ўсё часцей і часцей.

Трава была тут небагатая, найбольш асака. «Эх, удзялілі дзяляначку, растуды іх», — падумаў ён і ўспомніў, як крыўдавала маці, вярнуўшыся дамоў пасля падзелу. «Ведама, адна, без чалавека. Няма каму пастаяць... Нічога, ета ў апошні раз. Цяпер ён возьмецца, няхай паспрабуюць зрабіць яшчэ раз!..»

«Праўда, у Чарнушкі таксама надзел не лепшы. Што ж, ён сам вінаваты! Ціхі занадта. Яму хоць палец у рот пакладзі!.. Няхай сам абабіваецца, калі такая ўрода!..» А Васіль не дасць, каб клалі палец у рот! Не папусціцца!..

Нагам стала мокра. Спачатку вада дабіралася толькі, калі пасталы ўціскалі ножню, потым стала хлюпаць між куп'я. Неўзабаве Васіль ужо ўвайшоў у ваду, якая абступіла, нібы нанова абгарнула ногі. Ануча ўраз прамоклі, калашыны знізу таксама сталі мокрымі, і ногі зрабіліся важчэйшымі, быццам самі набраклі вадою. Ад намоклай

(Заканчэнне на 4-й стар.).

Мнагалюдна бывае пасля рабочага дня ў бібліятэцы Прысынкаўскага сельскага клуба Уздзенскага раёна. Для наведвальнікаў у чытальнай зале газеты, часопісы, шахматы, даміно. Добра афармлены стэнды: «Жыццё і дзейнасць Ул. І. Леніна», «Навука і рэлігія», «Гэта рашыў XXI з'езд КПСС». Працуе стол даведак.

У бібліятэцы вялікі выбар мастацкай, палітычнай, сельскагаспадарчай літаратуры. Кнігу тут чытаюць у кожным доме. Старым і інвалідам загадчыца бібліятэкі Ганна Дубовік дастаўляе літаратуру на дом.

На здымку (злева направа): згранам калгаса «Чырвоны Кастрычнік» Павел Крупнік, загадчыца бібліятэкі Ганна **Дубовік**, калгасніцы Алена **Трус** і Марыя **Гейсік** у бібліятэцы Прысынкаўскага сельскага клуба.

Фота **Ул. Крука.**

ЗНЯВЕЧАНЫЯ ДУШЫ

Я люблю дарожныя сустрэчы — выпадковыя, неспадзяваныя. Некаторыя з іх занатоўваю ў карэспандэнцкім блакноце. Можа давядзецца калі расказаць вось пра гэтага пасажыра, які зайшоў у вагон на гадзіну— праехаць ад станцыі да станцыі. Затым ён выйшаў і быццам пакінуў пасля сябе ў вагоне праменьчык святла. Або вось пажылая прыбіральшчыца з Шінскай гасцініцы. Прозвішча яе Ульянава. Яна з гонарам, проста і шчыра расказала пра сваіх дзяцей.

Аб чым толькі людзі не расказваюць у дарозе. У гэтых сустрачах неяк узбагачаешся з пазнаннем сціплай прыгажосці чалавека. Мабыць, таму і любяць дарожныя сустрэчы і пісьменнік, і студэнт, і той, хто толькі першы раз збіраецца да сваякоў ці ў адпачынак. Любяць усе, бо сустрэчы гэтыя — нібы глыток крынічнай вады ў спякотны ліпеньскі дзень. Хочацца ўспомніць і расказаць аб людзях, вочы якіх глядзяць адкрыта, словы шчырыя і цёплыя да блізкіх і далёкіх, да тых, хто жыве побач і хто выпадкова сустрэўся ў дарозе.

І вось гэтая выпадковая сустрача... Можа таму мне і не вельмі хочацца расказваць пра яе, што яна пакінула цяжкае, непрыемнае ўражанне. І ўсё-такі расказаць трэба. Трэба таму, што здаровы чалавек ніколі не адчувае свайго здароўя сам. Ён лёгка і вольна дыхае на поўныя грудзі, радуецца, што жыве на свеце. Так і ўсе мы, хто ніколі не пакідаў сваіх родных краёў, хто не быў чужым сярод чужых, хто не дыхаў паветрам нядобрых, злых нораваў, дзе чалавек не цэніцца, а проста — каштуе: так і мы ва ўсёй паўнаце яшчэ, можа, і не ўяўляем, што дадзена нам.

Чалавек, які страціў радзіму, падобны да рыбы, выплеснутай на бераг... Ён што птушка з перабітым крылом... Што лісце, адарванае і закружанае віхурай. Усе гэтыя параўнанні прыходзяць самі па сабе і адыходзяць, як слабыя, як нежывыя. Усе на свеце пачуцці можна перадаць больш ці менш яркай і вобразнай мовай. Толькі адно гэтае не гучыць на словах. Яму няма імя. Смутак, туга, гора? Не, не! Нешта, як бяздонне глыбокае, цёмнае, быццам лавіна, бязлітасна абрушылася на гэтую жанчыну, што сустрэлася мне па дарозе ў поездзе Берлін—Масква. Яе рэдкія валасы, закручаныя на ілбе прамымі старамоднымі буклямі, кароткая суконная спадніца нагадваюць далёкае і забытае... Такімі ўяўлялі мы, дзяўчынкі-падлеткі, у гады вайны ўсіх без разбору «нямецкіх фраў», што пацягнуліся за сваімі гансамі і фрыцамі на нашу зямлю. Іменна такімі — з тонкімі, падціснутымі губамі, з рыжаватымі буклямі, з тварамі, якія ад густога пласту пудры падобны на маскі.

Яна сядзіць на самым краі лаўкі плацкартнага вагона. Рукі як нежывыя, вісяць уздоўж грубой суконнай спадніцы.

— Вы руская? Беларуска? Дзе ваш дом? Куды вы ездзілі? — падхапілася яна. — Колькі вам гадоў? — запытала ў мяне.

— Я не ведала, адкуль узялася гэтая цікаўная пасажырка і што ёй ад мяне спатрэбілася.

— Давайце, можа, спачатку прысядзем дзе-небудзь...

— Так, так... Прысядзем, — згадзілася яна. — Ведаеш, ты першая руская, якую за васемнаццаць гадоў угледзела я, — сказала фрау, нібы прасіла прабачэння за свае пытанні і ціха дадала: — Я таксама жыла калісьці тут, на Беларусі...

Праваднік пачуў яе словы, павярнуўся і колькі хвілін уважліва ўглядаўся ў яе твар. Калісьці ён быў салдатам, ішоў вось па гэтай зямлі з-пад Масквы да Берліна дарогаю вайны. У кішэні ў яго ляжала фотакартка беларускай дзяўчыны, якую колісь фашысты забралі ў палон... Ён рэзка схамянуўся, быццам адагнаў ад сябе далёкія, цяпер непатрэбныя, успаміны, і звярнуўся да яе суха, але ветліва (як і належыць на службе):

— Ваш білет, фрау... Бітэ...

А потым павярнуўся да мяне і запытаў:

— Ваш білет, грамадзяначка, калі ласка.

Яна адказала яму таксама па-нямецку, выняла два доўгія білеты са шматлікімі кампосцерамі станцый, з потым, калі праваднік павярнуўся да нас спіной, ціха сказала:

— Фрау... Чаму ён так? Ён жа чуў, як я размаўляла па-руску. Хіба я дрэнна вымаўляю словы?

І змоўкла надоўга.

Ціха пагойдваўся вагон і ў такт стуку колаў чуліся за сценкай сусеняга купэ кароткія, глухія ўсхрапванні яе спадарожніка, мужа, як даведалася я потым. Не ведаю, што мацней — сон або цікаўнасць. І тое і другое мучыла мяне аднолькава. Але я таксама маўчала, не падганяла яе пытаннямі. Няхай пасядзіць вось так, памаўчыць, падумае, успомніць... Што ўспомніць: можа рабіну ля роднага дома, гародчык пад вокнамі з жоўтым полымем вяргінь ці рукі і вочы жанчыны, што дала ёй жыццё калісьці даўным-даўно ў простай беларускай хаце, што калыхала яе на прызбе... Няхай пасядзіць з апушчанымі ўздоўж суконнай спадніцы рукамі і паварушыць памяць. Што прыгадае яна пад гэты стук колаў? Матчын голас або шум маладых бярозак вакол школы, куды бегала яна з дзяўчынкамі зімой, увосень, ранняй вясною. Такой вясною, якая бывае толькі ў адным месцы на зямлі — там, дзе прайшло тваё маленства. Такой вясною, якая бывае толькі ў адным краі на зямлі — там, дзе пачыналася тваё юнацтва.

Вось у гэты момант і адчула я: штосьці пакутлівае і цяжкае перажывае зараз гэты чалавек...

Усё, што расказала яна мне пасля, было ўжо не такім патрэбным і значным, хоць па-свойму і цікавым. Вехі на шляху, але не сам шлях. Вайна, як злая мачыха з дзіцячай казкі, раскідала людзей, і яе закінула аж да берагоў далёкай Галандыі.

— Нас везлі, як жывёлу ў замкнёных вагонах, і нават на ваданой вадзілі на станцыях, як водзяць жывёлу, — пачынала свой расказ жанчына. — І ведаеш, на кожным пероне ў Галандыі мясцовыя фермеры выбіралі сабе дужых і рослых дзяўчат, мацалі нашы мускулы, нават у зубы глядзелі... А мяне ніхто доўга не хацеў браць, бо была маленькая і кволая. Толькі на самай апошняй станцыі, калі выбару ўжо не было, адкормлены лысы фермер — такімі калісьці ў школе мы маляваді буржуяў — тыцнуў пальцам у грудзі і загадаў:

— Ідзі!

На ферме Ліндэна я сустрэлася са сваім цяперашнім мужам. Ён быў такі ж батрак, як і я, хаця і галандзец. У яго былі дзіравыя штаны ды дзве пары кашуль. Аднойчы яму пашанцавала — выйграў на латарэйны білет даволі значную суму, і ледзь не звар'яцеў ад шчасця. Задумаў стаць гаспадаром, вырвацца з вечнай галечы, з рабства. Усё вылічваў штосьці, шэпчучы сам сабе, курыў і маўчаў. Маўчаў і курыў... Бачыла я маўклівых людзей, але такіх, як ён, яшчэ не даводзілася сустракаць. За васемнаццаць гадоў ён вымавіў, ну, можа, ад сілы сотні дзве шчырых слоў, апрача загаду: «зрабі тое або зрабі гэта». Але чалавек ён неблагі, мяне не крыўдзіць, жывём вось так, моўчкі. Я таксама даўно ўжо развучылася гаварыць.

Васемнаццаць гадоў двое батракоў — яна і муж, «ашчасліўленыя» латарэйным білетам, марылі стаць гаспадарамі. Усё разлічылі, усё звялі да рэжыму самай строгай нечалавечай эканоміі. Лішнюю шклянку кавы? Не, не! Лішнюю цыгарэту? О, не!

— Мы нават у свята працавалі— за гэта нам плацілі ўдубальт. І ўсё адкладвалі. Дзяцей сабе не дазволілі мець — так і засталіся бабылямі на ўсё жыццё... Цяпер у нас ёсць свой дом, кватарантаў маем...

Гаспадыня... Дык вось адкуль на твары яе гэткая вальяжнасць, гэтая белая пульхная маска. Пудра схавала зморшчкі — сляды васемнаццацігадовых клопатаў, суровай эканоміі. Не жыве, не свеціцца яе без пары састарэлы і застыглы твар. Толькі як успомніла аб доме, на хвілінку праслізнуў выраз спакою і задаволенасці, пад якім схавалася пустэта адзінокага, бяздзетнага жыцця.

Гаспадыня... І на хвіліну ўявілася мне: раніцой вось гэтая жанчына стукае патрабавальна, настойліва ў чужыя дзверы. Ёй адчыняе пажылы батрак. Калісьці ён жыў таксама ў закутку на ферме Ліндэна. Але так і не здолеў да канца сваіх дзён «выбіцца ў людзі».

— Даруйце, гаспадыня, заўтра я расстараюся грошай, заплачу вам за кватэру. Не хвалюйцеся!

А яна, цяпер ужо «не раўня» яму, і не думае хваляваца. Яна ведае: на яе баку, на баку ўласніка, стаіць няўмольны закон. Яна нават не прыгадае цяпер, як некалі сама тулялася па чужых кутках, калацілася ад строгага позірку гаспадыні. Грошы, якія трэба аддаць на лякарства, батрак аддае ёй, гаспадыні... Чамусьці ён уяўляецца мне старым з твару, вельмі падобным да геніяльнага галандскага мастака Рэмбрандта, які памёр у безвыходнай галечы.

А яна возьме яго апошнія грошы і душа яе не ўзрушыцца ніколечкі. Амаль два дзесяцігоддзі дыхала яна атручаным паветрам, дзе толькі— грошы, грошы і грошы... І з памяці, як са старой манеты, сцёрлася ўжо ўсё тое, што калісьці гаварылі ёй у савецкай школе, як забыліся тыя фігуркі буржуяў, што былі намаляваны рукою дзяўчынкі ў піянерскім гальштуку. На месца сэрца, чалавечнасці, душы сталі грошы. І толькі гэтыя строга паралельныя буклі неяк не па-нашаму будуць абурацца разам з ёю, ледзь прыкметна пагойдвацца ўправа, улева.

— Ай-яй! Што вы за людзі! Жыць як след не ўмееце. Вось мы з мужам...

Але кватарант ужо не слухае. Заўтра ён зноў падасць дрыжачымі рукамі некалькі зашмальцаваных паперак. Няхай атрымае яна і радуецца. Гэта і будзе порцыя шчасця, дазеная жанчыне на чужой зямлі, дзе без кахання, без дзяцей, без радзімы прамарнела яна лепшыя свае гады. І, напэўна, самой ёй будзе здавацца, што грошы кватаранта — гэта лекі ад смутку па радзіме, плата за страчаную маладосць і непазбежную адзіноту старасці на чужыне.

Зноў маўчым мы абедзве. Зноў слухаем толькі стук колаў і храп за перагародкай. Чаму яму не спаць начамі, навошта яму ўглядацца ў вокны? Для яго край — чужына. Паехаў ён у турысцкае падарожжа на радзіму сваёй жонкі не з-за цікаўнасці. Там, у Галандыі, яму сказалі, што ў Расіі можна купіць некаторыя рэчы ў два разы танней, чым у сябе дома. І ён спіць спакойным сном.

А яна сядзіць прыгнуўшыся, маўчыць і бясконца ўглядаецца ў вокны. Закончыць свой расказ, зноў памаўчыць і раптам здзівіць нечаканым пытаннем:

— У вас ёсць дзеці?

Я моўчкі дастаю з сумкі фотакарткі сваіх дзяцей — сына і дачкі. Яна доўга ўглядаецца ў твар майго хлопчыка, то хмурыць бровы, то шэпча нешта сама сабе, то ціха ўсміхаецца...

Пломбы на камплектах пасцеляў, што паслаў ёй і мне праваднік, так і засталіся некранутымі да раніцы. У яе руках усё яшчэ картка майго маленькага сына. Яна паціху, у такт стуку колаў, пагойдваецца ўсім целам, быццам гушкае дзіця...

...Перад тым, як выйсці з вагона, я пачаставала маўклівага галандца і яго жонку сакавітымі, духмянымі брэсцкімі яблыкамі. Ён з прыемнасцю патрымаў нейкі момант яблыкі ў руках, а потым акуратна ўпакаваў у сакваяж. І падаў мне ў знак удзячнасці... дзве цыгарэты. Я выйшла на перон, асцярожна падыйшла да урны са смеццем і паклала на яе край дзве доўгія галандскія цыгарэты з пазалочанымі мундштукамі. Здавалася мне, што ад іх таксама крышку патыхала пахам лекаў, якіх не мог купіць той няшчасны батрак.

Алена УЛАДЗІМІРАВА.

РАСТРАПОВІЧ Іграе канцэрт ШАСТАКОВІЧА

У праграме сімфанічнага канцэрта, які адбыўся ў мінулую суботу ў зале акруговага Дома афіцэраў, усе творы былі для мінчан навінкай.

Творчасць нямецкага кампазітара І. Брамса, аднаго з буйнейшых сімфаністаў другой палавіны мінулага стагоддзя, карыстаецца ў нашай краіне заслужанай папулярнасцю. Мінскім аматарам музыкі добра вядомая Чацвёртая—трагічная сімфонія Брамса, якая ўжо шмат разоў выконвалася; у адным з нядаўніх канцэртаў прагучала яго Першая—гераічная сімфонія. І вось цяпер у праграму была ўключана Другая — ідылічная сімфонія—несумненна, адзін з лепшых твораў нямецкага кампазітара. Твор вызначаецца пастаральнымі рысамі. Напісаная пад уражаннем падарожжа кампазітара па аўстрыйскіх Альпах, Другая сімфонія малюе лірычнага героя на фоне цудоўных карцін прыроды і сцэн мірнага сельскага жыцця.

Маскоўскі госць, дырыжор Г. Юдзін прадырыжыраваў Другой сімфоніяй Брамса карэктна, але без сапраўднага творчага натхнення. Музыцы Брамса не ўласцівы вонкавая яркасць, кідкасць. Таму ад дырыжора патрабуецца своеасаблівасць выканаўчай індывідуальнасці, высокі ўнутраны артыстызм, якіх нашаму госцю якраз не ставала. Аркестр пад яго кіраўніцтвам не столькі музыцыраваў, колькі старанна выконваў ноты тэкст.

Цэнтральнай падзеяй у гэты вечар было выкананне заслужаным артыстам РСФСР, прафесарам Маскоўскай кансерваторыі М. Растраповічам Канцэрта для віяланчэлі з аркестрам лаўрэата Ленінскай прэміі Д. Шастаковіча. Гэты канцэрт, створаны Шастаковічам у 1959 г., належыць да ліку найбольш светлых і, разам з тым, драматычна яркіх, дынамічных твораў выдатнага савецкага кампазітара. Энергічная музыка першай часткі, з характэрнай тэмай, якая атрымлівае ў далейшым развіццё і становіцца асноўнай музычнай ідэяй твора; пявучая другая частка з цудоўнай мелодыяй рускага песеннага складу; развітая і вельмі арыгінальная кадэнцыя саліруючай віяланчэлі; незвычайна дынамічны фінал, поўны іскрамётнай весялосці і віртуознага бляску; да ўсяго гэтага высокае майстэрства кампазітара, сапраўднага сімфаніста-драматурга— такія характэрныя асаблівасці віяланчэльнага канцэрта Шастаковіча.

Кампазітар прысвяціў свой канцэрт яго першаму выканаўцу М. Растраповічу — актыўнаму прапагандысту твораў савецкай музыкі. У гэтага таленавітага віяланчаліста ёсць усё: выдатная тэхніка, жаяа дазваляе лёгка пераадольваць любыя цяжкасці (а такіх у канцэрце Шастаковіча нямала!), прыгожы гук, музычнасць, артыстызм, высакародны густ.

Растраповіч выканаў віяланчэльны канцэрт Шастаковіча вельмі тэмпераментна, з вялікім захапленнем, з несумненнай улюбёнасцю ў музыку гэтага твора і пацягнуў за сабою дырыжора і аркестр, якія паспяхова пераадолелі цяжкасці і «падводныя каменні» складанага акампанементу.

На жаль, у аркестры не ўсё было ў парадку. У прыватнасці, у ім адсутнічала чэлеста—любімы Шастаковічам інструмент, так арганічна выкарыстаны ў другой частцы канцэрта. Партыя чэлесты была вельмі невыразна выканана на раялі—і арыгінальны, поўны паэзіі эпізод прагучаў цьмяна.

Шматлікія слухачы горача віталі М. Растраповіча, які пазнаёміў нас з цікавым творам Шастаковіча. Міжволі прыгадвалася, што выдатныя ўзоры музыкі гэтага буйнага сучаснага сімфаніста, у прыватнасці яго Шостая, Сёмая, Восьмая і Дзевятая сімфоніі, у Мінску да гэтага часу не выконваліся.

Завяршыла праграму канцэрта увертюра да оперы Вердзі «Сіла лёсу»—адна з лепшых вердзіеўскіх увертюр. Яна была добра выканана дырыжорам і аркестрам.

Філармонія да кожнага сімфанічнага канцэрта выпускае друкаваныя бясплатныя праграмкі і анатацыі для слухачоў. Гэта вельмі патрэбная і карысная справа. Шкада толькі, што ў гэтых выданнях нярэдка сустракаюцца прыкрыя недакладнасці і памылкі. Так, у анатацыі да апошняга канцэрта опера Вердзі «Сіцылійская вячэрня» чамусьці названа «Сицилианская вечерняя».

Ю. ВУСКОВІЧ.

У ТВОРЧЫХ СЕКЦЫЯХ

Размова толькі пачалася

Дзейснасць кнігі залежыць не толькі ад яе зместу, але і ад таго, як яна афармлена.

Афармленне кнігі, яе твар — галоўнае, пра што гаварылі на нарадзе мастакоў-графікаў, паэтаў і работнікаў выдавецтва.

Пытанне гэта важнае і сур'ёзнае. Гаварыць аб ім патрэбна, гаварыць не дзеля «пташачкі» ў спісу мерапрыемстваў, а для паляпшэння афармлення кнігі як мастакамі, так і для павышэння паліграфічнай культуры выданняў.

Мастацкае афармленне нашых кніг не задавальняе чытача. Кнігі выдаюцца пераважна ў шэрых, несамавітых вокладках, прымітыўна афармленых. Многія тлумачаць гэта нізкай якасцю паперы, абмежаваным асартыментам пераплётнага матэрыялу, але не ўлічваюць недахопы ў рабоце рэдакцый мастацкага афармлення выдавецтва і работнікаў друкарні.

Нельга не згадзіцца з дакладчыкам мастаком В. Ціхановічам: ёсць у нас таленавітыя графікі, ёсць пэўныя дасягненні. Малады мастак А. Кашкурэвіч, які толькі ў мінулым годзе скончыў Беларускі дзяржаўны тэатральна-мастацкі інстытут, аформіў шмат кніг. Сярод іх вылучаецца кніга А. Сціля «Любіць будзем заўтра». Гэта кніга ў мяккай супервокладцы, на вокладцы з добрым і тонкім густам намаляваны надломлены цюльпан. Уся кніга ілюстравана гэтым жа мастаком. Калі б лепшая папера, кніга магла б быць узорам сучаснага афармлення.

Вылучаюцца кнігі, афармленыя мастакамі П. Калініным, М. Карпенкам, Г. Паплаўскім і інш.

На жаль, частка нашых мастакоў глядзіць на афармленне кніг як на дадатковы заробак, няма ў іх пачуцця творчай рэўнасці, творчага спаборніцтва пры афармленні кніг.

Вось кніжка А. Рылько «Ты прыгожая, Арынка» (мастак Аракчэеў). На шэравата-сінім фоне вокладкі размешчаны тры радкі курсіўнага шрыфту (назва кнігі), а ўнізе плакатны партрэт дзяўчыны. Трэба думаць, што гэта і ёсць «прыгожая» Арынка. Але наўрад ці хто з гэтым пагодзіцца.

Вельмі дрэнна афармляецца масава-палітычная і сельскагаспадарчая літаратура: першай займаюцца 12 мастакоў, другой — 4. У выніку — спешка, нізкая якасць афармлення. Выдавецтву трэба шукаць лепшыя сілы з ліку маладых графікаў, наладзіць цесную сувязь з мастацкім інстытутам. Трэба шукаць шляхі паляпшэння знешняга выгляду нашай кнігі, заўважаць недахопы і пазбаўляцца іх.

Як гэта зрабіць? Прапаноў было шмат. Сказалі сваё слова мастакі, паэты, работнікі выдавецтва.

— Лаканізм мастацкіх сродкаў — вось аснова графікі. Мы павінны выяўляць поўнасцю змест скупымі сродкамі,—гаворыць галоўны мастак выдавецтва М. Гуціеў.

Сапраўды, у нас для гэтага ёсць усе магчымасці. Неабходны цесныя ўзаемаадносіны мастакоў з паліграфічнымі кадрамі. Паліграфісты—гэта саўтары кнігі. І яны павінны працаваць ва ўнісон з мастакамі. Дасягненні паліграфіі—новую тэхналогію, гальванапластыку, спосаб атрымання новых фарбаў—трэба шырэй укараняць у вытворчасць.

— За гэта трэба ўзяцца агульнымі сіламі,—адзначыў галоўны інжынер паліграфічнага камбіната т. Шаўчэнка.

Мастакі павінны ведаць і ўлічваць магчымасці паліграфічнай базы. Стварыць малюнак—адно, а перадаць яго паліграфічна—другое. Трэба дамагацца яснасці і выразнасці тонаў, каб не было шэрасці ў афармленні.

— Нам трэба знайсці ў афармленні свой твар, каларыт, каб чытач, убачыўшы кнігу, ведаў яе «геаграфію»,—гэтыя словы дырэктара выдавецтва т. Матузава былі з адабрэннем сустрэты ўсімі ўдзельнікамі нарады.

Пытанне аб афармленні паэтычных зборнікаў абмяркоўвалася раней на секцыі паэзіі. На гэтай нарадзе паэты А. Вялюгін і А. Русецкі зноў выказалі мастакам і паліграфістам прэтэнзіі да афармлення кніг. На вокладках паэтычных зборнікаў, дзе вельмі тонка патрэбна раскрыць задуму аўтара, з'яўляюцца шаблонныя парачкі, няўдалыя, шэрыя пейзажы.

На нарадзе былі ўзняты важныя пытанні, было шмат прапаноў: праводзіць кароткі агляд графічнай якасці новай літаратуры за кожныя 2 месяцы, наладжваць конкурсы па афармленню кніг, бо яны ў нас праводзяцца чамусьці толькі на плакаты. Часта кнігі афармляюцца графікамі без ведання шрыфтоў, мастак цалкам пакладаецца на ўласны почырк, і таму атрымліваецца, што літары на вокладцы разбягаюцца ў розныя бакі, не падобныя адна да другой. Мастакам трэба неадкладна ўзяцца за вывучэнне шрыфтоў. Але гэта толькі пачатак, бо якасць афармлення кніг заўсёды павінна хваляваць і пісьменнікаў, і мастакоў, і паліграфістаў.

Н. ЛАГУН.

Асвятляць і накіроўваць літаратурны працэс

Адбыўся сход секцыі крытыкі СП БССР, на якім абмеркаваны крытычныя і літаратуразнаўчыя матэрыялы, надрукаваныя ў часопісах «Полымя» і «Неман» за мінулы год.

З дакладам аб крытычных матэрыялах у «Полымі» выступіў **А. Лойка**. Наколькі шырока і вычарпальна адлюстроўваецца ў часопісе літаратурны працэс, які ўплыў аказваюць літаратурна-крытычныя выступленні на жывую пісьменніцкую практыку, наколькі глыбокія і ўсебаковыя ацэнкі даюць крытыкі і рэцэнзенты «Полымя» асобным творам нашай літаратуры — вось пытанні, на якіх спыніўся дакладчык. Ён адзначыў, што раздзелы крытыкі і бібліяграфіі ў часопісе ў параўнанні з ранейшымі гадамі значна палепшыліся, стала больш змяшчацца праблемных, аглядных артыкулаў, у якіх закранаюцца надзённыя пытанні літаратурнага развіцця. Добрымі атрымаліся агляды «Пісьменнік і сучаснасць» Я. Брыля, «Творчы пашпарт пісьменніка» В. Віткі, артыкулы Р. Бярозкіна, А. Кучара, Л. Смальянавай, Ул. Юрэвіча і інш. Асабліва шырока, на думку дакладчыка, на старонках «Полымя» ішла гаворка пра паэзію, у той час, як праблемы прозы асвятляліся бедна. І зусім мала было артыкулаў пра драматургію.

А. Лойка падрабязна разглядае серыю артыкулаў Р. Бярозкіна, аб'яднаных назвай «Паэты аднаго пакалення» і, высока ацэньваючы гэту працу, адзначае аднак некаторыя спрэчныя моманты ў ёй, палемізуе з крытыкам.

Станоўчым у рабоце часопіса дакладчык лічыць увагу з боку крытычнага аддзела да маладых пісьменнікаў, увагу да пытанняў дзіцячай літаратуры і праблем літаратуразнаўства.

Гаворачы аб уплыве крытыкі на чытача, А. Лойка выказвае пажаданне, каб крытычныя выступленні ў часопісе не выпускалі з-пад увагі аматараў літаратуры, бо часта ствараецца ўражанне, што часопіс змяшчае артыкулы і рэцэнзіі выключна для пісьменнікаў.

Пра крытычныя артыкулы, рэцэнзіі ў «Немане» гаварыў старшыня секцыі крытыкі **Ул. Юрэвіч**. На яго думку, яны яшчэ не вызначаюцца мэтанакіраванасцю, не заўсёды ўзнімаюць актуальныя пытанні літаратурнага развіцця, часта залішне многа ўвагі аддаецца ў часопісе другараднаму, неістотнаму. Але Ул. Юрэвіч адзначае і значную колькасць артыкулаў пра драматургію, змешчаных у часопісе і напісаных грунтоўна і вычарпальна.

Часопісу трэба стаць бліжэй да літаратурнага працэсу, менш змяшчаць артыкулаў аглядна-юбілейных, зрабіць больш разнастайным раздзел бібліяграфіі.

У спрэчках былі закрануты некаторыя пытанні сувязі крытыкі з жыццём, уплыву яе на густ чытачоў **(Ул. Варно)**, гаварылася аб недастатковым асвятленні часопісамі праблем і заканамернасцей літаратурнага працэсу **(М. Луфераў)**. Поспехі ў рабоце крытычнага аддзела «Полымя» адзначыў у сваім выступленні **Д. Бугаёў**, некаторыя палажэнні дакладу А. Лойкі аспрэчвалі **Р. Бярозкін** і **А. Клышко**. Аб асвятленні крытыкай апошняга перыяду творчасці П. Панчанкі гаварыла **В. Гапава**. Аб планах аддзела крытыкі і бібліяграфіі «Полымя» расказаў **Р. Шкраба**.

Трэба аднак зазначыць, што размова аб крытыцы ў нашых часопісах магла быць больш грунтоўнай, чым тая, што адбылася на сходзе. Але, бясспрэчна, што абмен думкамі па некаторых пытаннях крытыкі, парады і прапановы, выказаныя ў выступленнях, прынясуць пэўную карысць і самім крытыкам, і супрацоўнікам часопісаў «Полымя» і «Неман».

У Кастрычніцкім раёне сталіцы

«Чытайце творы беларускіх пісьменнікаў»

Так названа кніжная выстаўка, арганізаваная масавай бібліятэкай № 1. На ёй ёсць творы Якуба Коласа, Янкі Купалы, Кандрата Крапівы, Міхася Лынькова, Івана Шамякіна і іншых пісьменнікаў.

Шмат кніг беларускіх пісьменнікаў прачыталі рабочы камвольнага камбіната Г. Пераход, токар электрарамонтна-механічнага завода Я. Вашкевіч, шафёр Іван Барсук, навучэнец рамесніцкага вучылішча Міша Плаксін і інш.

Кнігі прадаюцца ў бібліятэцы

Добрую ініцыятыву праявілі работнікі бібліятэкі імя Л. М. Талстога. Тут побач з выдачай кніг на дом арганізаваны продаж літаратуры. У продажы ёсць вялікая колькасць твораў пісьменнікаў рэспублікі, краін народнай дэмакратыі. Многія наведвальнікі бібліятэкі набываюць літаратуру.

Л. ФРЫД.

РАНІЦА

(Заканчэнне. Пачатак на 3-й стар.).

тканіны ногі першы час, пакуль не прывык крыху, непрыемна казытала. Але Васіль амаль не звяртаў на ўсё гэта ўвагі, — хадзіць па балоце даводзілася ўжо нямала, і ў пасталах, і без пасталоў, і ўсе такія дробныя прыкрасці здаваліся звычайнымі. Горш было тое, што скошаны рад цяпер лажыўся ў ваду. Трэба будзе зграбаць у вадзе, несці на сухое і раскідваць там, каб прасохла. Столькі лішняга клопату.

Вось што добра, — вада цёплая. Не студзіць ног, не гоніць дрыжыкі па целу, як у іншыя дні ўвосень або зімою, калі ад халодных мокрых анучаж дух займае. Цёплая вада, і—дзякуй богу. Ідзі, хлюпай пасталамі, вадзі касой мерна, роўна, справа налева, справа налева. Праўда, трохі цяжэй стала ісці, — касу трэба амаль увесь час трымаць на вісу, многа вады. Касіць тут не тое, што на сухім месцы. Запытай любога каранёўца, і ён табе скажа, што «Моклішча»—чортава месца, гіблае для касца.

«А чаго яе, гэтую сенажаць, так завуць? «Моклішча»... — падумалася Васілю. — Хіба ж толькі таму, што недалёка сяло, якое называецца Моклішчы? Пэўна, каб суха тут было, то на сяло не паглядзелі б, далі б лугу мянушку не такую. А так от — «моклішча» і «моклішча», мокрае, гіблае месца...»

Часам каса чапляла ваду, уздымала, раскідвала пырскі, што разляталіся, весела пабліскваді на сонцы. У вадзе каса шыркала інакш, як без вады, гушчэй, важчэй, працяжней.

Усё мацней ўгравала. Пот мачыў цёрдыя, двух колераў валасы, поўз на лоб, абпалены сонцам, засцілаў вочы, цёк на кволыя, яшчэ амаль дзіцячыя грудзі, прыклейваў да спіны ўшчэнт змакрэлую сарочку.

Каса станавілася ўсё цяжэйшай. Рукі наліваліся стомаю, балелі ў локцях і плячах, слабелі, нагам было млосна. Млосць расплывалася і па ўсім целе. Хацелася сесці. З цягам часу жаданне гэтае не толькі не адыходзіла, а ўсё мацнела. Сесці хоць на купіну, хоць у ваду. Пасядзець трохі, адпачыць, а там можна зноў устаць, зноў ісці.

Але Васіль не сеў. Ён трываў. Гэта было ўжо не ў навіну—цярпець, адольваць стому, адганяць прываблівую спакусу пагуляць, паленавацца. Зялёны гэты хлопец ужо з найпершага маленства адчуў, што жыццё—не вясёлае, бесклапотнае свята, а найбольш доўгі і клопатны будзень, што трэба цярпець. З усіх мудрасцей жыцця ён, як адну з найпершых, уведаў—трывай, цярпі! Усім цяжка бывае, усе цярпяць, цярпі і ты!

Гэтаму яго вучыла маці, вучыў не багаты, не малы горкі вопыт. І ён цярпеў. Аблізваў пот салёны з губ, выціраў валасы, выцягнуў ніз сарочкі са штаноў, каб ветрык мог запаўзці, астудзіць. І ўсё ж, якая цяжкая была цяпер каса, як цяжка было адганяць млосць і слабасць у руках і ў нагах! І як хацелася сесці! Проста дзіва!

Ужо ні пра што не думалася, ні пра тое, дзе цяпер дзядзька Цімох, перагнаў ці не; нават пра тое, што вось ён, Васіль, не зялёны, а сталы чалавек, гаспадар.

Толькі калі знямогся зусім, калі дрыготкія, бясільныя рукі апусцілі страшэнна важкую касу і не маглі ўжо скрануць, уваткнуў кассё ў купіну, падаўся да калёс. Ішоў важка, павольна, цягнучы ногі, што хлюпалі ў цёплай вадзе. З выгляду гэта быў падлетак, худы, даўгарукі, з тонкай шыяй, а па хадзе, па прыгорбленай постаці — мужчына.

Васіль ішоў нібы напіцца. Маці, завязаўшы хустку па-дзявочы, як касынку, — камары ўжо не назалялі — горача, — зграбала траву, абярэмкамі на граблях зносіла на сухое. З травы цякла вада, і яна старалася трымаць абярэмак і граблі перад сабою. На сухой пожні ўжо было крыху разасланай травы.

Кінуўшы траву, яна зірнула на яго, і Васіль заўважыў, як на твары яе з'явілася шкадаванне. Хмурная, выцерла рукою мокрую спадніцу.

— Перадыхні!.. Паляжы вунь там, у цяньку... Управімся, нідзе не дзенецца... трава етая.

Калі ён паваліўся ў траву каля воза, нахіліўся, пяшчотна пагладзіла па галаве. Кончыкі губ яе крывіліся, як з болю.

— Гаротнік ты мой!.. Надзея ты мая ясная!..

* * *

Пад вечар стары Чарнушка і Васілёва маці сабраліся ў сяло. Маці трэба было ехаць, каб накарміць Валодзьку, падаіць карову, дагледзець гаспадарку. У Чарнушкі ж дома была хворая жонка.

Хведзька і Ганна заставаліся начаваць на лузе. Заставаліся тут і біклажка, і каса, і латаная світа, — нашто ж вазіць туды-сюды без прычыны!

— Трымайся каля Васіля, — наказаў Чарнушка дачцы, сеўшы на калёсы. — І ты, Васіль, глядзі за імі. Дзеўка яна—дзеўка. І малое...

Маці, задаволеная тым, што Чарнушка ўзяўся падвезці, ахвотна падтрымала:

— Жывіце дружненька!

Васіль прамаўчаў. Але калі калёсы схаваліся ў лесе, ён адчуў, што нічога горшага, як застацца аднаму з Ганнаю тут, не можна было б і прыдумаць. Лепш бы і ён паехаў дамоў, чым начаваць тут з ёю!..

Днямі калектыў Тэатра імя Янкі Купалы паказаў сталічнаму гледачу новы спектакль па п'есе беларускага драматурга А. Маўзона «Твой светлы шлях». Рэжысёр спектакля народны артыст БССР Л. Рахленка. Мастацкае афармленне студэнтаў Тэатральна-мастацкага інстытута Ул. Гарадзенкі і І. Новікава. У спектаклі заняты артысты: Г. Глебаў, Л. Ржэцкая, В. Пола, В. Краўцоў, А. Бараноўскі, М. Яроменка, К. Сянкевіч, М. Захарэвіч, Л. Давідовіч і іншыя.

На здымку: сцэна са спектакля «Твой светлы шлях».

Фота **Ул. Крука.**

Галоўны рэдактар Янка ШАРАХОЎСКІ.
Рэдакцыйная калегія: Заір АЗГУР, Аляксандр БУТАКОЎ, Кастусь ГУБАРЭВІЧ, Васіль ІВАШЫН, Аркадзь МАРЦІНОВІЧ (адказны сакратар), Пятро ПРЫХОДЗЬКА, Раман САБАЛЕНКА (намеснік галоўнага рэдактара), Мікола ТКАЧОЎ, Іван ШАЦІЛА, Рыгор ШЫРМА.

«Литература и искусство» — орган Министерства культуры и правления Союза писателей БССР, Минск.

АДРАС РЭДАКЦЫІ: г. Мінск, вул. Захарава, 19. Тэлефоны: прыёмнай рэдакцыі — 3-24-61, намесніка галоўнага рэдактара — 3-25-25, адказнага сакратара — 3-25-25, аддзела літаратуры— 3-22-04, аддзела мастацтва — 3-24-62, аддзела культуры—3-20-54, выдавецтва—3-19-52, бухгалтэрыі — 3-11-03.

«Літаратура і мастацтва» выходзіць два разы на тыдзень: у аўторак і пятніцу

АТ 00074